Пралетары усіх краеў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

Кошт нумару 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Нявыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вярочаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрасу: іншагародняя	— 20 к.
мясцовая	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок паннарэлі пасьля тэксту	— р. 50 к.
За радок паннарэлі насярод тэксту	1 р. — к.
За радок паннарэлі перад тэкстам	1 р. 50 к.

Сялянскія на 50 проц. даражэй.

Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.
АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 год выданьня. — ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. — № 120 (2609) Чацьвер, 30-га мая 1929 г.

За генэральную лінію партыі.

МАСКВА, 29-V. Партыя і ўся краіна з вялікай увагай сачылі за працамі V Зьезду, за выступленьнем кожнага дэлегата, рабочага і селяніна. Адказ Зьезду на пытаньні, пастаўленыя ў дакладах, быў настолькі ўпэўненым, што пасьля яго павінны былі змоўкнуць прароцтвы правых панікёраў. Зьезд падкрэсьліў пастановы партыі з усёй магутнасьцю волі міліёнаў рабочых і сялян, усёй магутнасьцю вялізарнага масавага вопыту.

На Зьезьдзе не раздавалася ніводнага голасу смутку, ніводнага голасу згоды з тэорыяй адступленьня і «дэградацыі», якімі правалі спалохаць партыю лідэры правай апазіцыі. У выступленьнях прамоўцаў была выказана моцная ўпэўненасьць у тым, што ўсе цяжкасьці будаўніцтва будуць пераможаны. Гэта непарушная ўпэўненасьць тым больш яскрава, што ў выступленьнях ня было нічога падобнага да замазваньня цяжкасьцяй, якія яшчэ будуць.

У гэтых адносінах вельмі паказальны спрэчкі па дакладу т. Калініна аб шляхох сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі.

Зьезд павінен быў выказацца аб тэрмінах правядзеньня агрэмінімуму і кантрактацыі, аб развязаньні зернавой праблемы і задачах вытворчага каапэраваньня і калектывізацыі. Перад зьездам быў абмалёван шлях капіталістычнага разьвіцьця сельскай гаспадаркі і шлях сацыялізму, які нясе вялікі рост вытворчых сіл, уздым сельскай гаспадаркі і дабрабыт шырокіх бядняцкіх і серадняцкіх мас вёскі, але зьвязаны з цяжкай барацьбой за пераможаньне капіталістычных элемэнтаў, за пераможаньне ўласнай тэхнічнай і культурнай адсталасьці.

Зьезд выразна выказаў свой выбар паміж двума шляхамі. Ня гледзячы на пэсымістычныя прадказаньні правых ухілістаў, партыя знашла шлях да сьвядомасьці мас і абудзіла ў іх творчы энтузіязм, гэту вярнейшую паруку перамогі.

Корань пытаньня зараз знаходзіцца ў тым, каб цьвёрдай рукой сапраўды перавесьці ўсе нашы апараты на работу па абслугоўваньні і пашырэньні вытворчай змычкі, каб гэтым даць правільны практычны кірунак масавай ініцыятыве і самадзейнасьці.

Калі ў свой час Ленін прапанаваў пасьпяшыць з устанаўленьнем змычкі, дык зараз неабходна ў разьвіцьцё гэтай дырэктывы пасьпяшыць з палепшаньнем якасьці работы па правядзеньні змычкі ў яе новай вытворчай форме.

Зацьвердзіўшы пяцігадовы плян разьвіцьця народнай гаспадаркі, Зьезд зрабіў яго выкананьне вярхоўным законам.

Абапіраючыся на волю Зьезду, на волю мас, складаючых пераважную большасьць краіны, мы павінны ў шмат разоў узмацніць барацьбу са ўсімі скажэньнямі клясавай лініі, бюракратызмам, валакітай і нядбайнасьцю да працы, выкарыстоўваючы ўсе рычагі ўзьдзейнічаньня і ў першую чаргу сацыялістычнае спаборніцтва. Адсейваючы нягодныя элемэнты, падахвочваючы лепшых і падцягваючы адстаючых, мы даб'емся палепшаньня работы і выкананьня зацьверджаных плянаў. „ПРАВДА".

НА ЗЬЕЗЬДЗЕ САЦЫЯЛ-ФАШЫСТАЎ.

С.-д. міністры ніколі ня супярэчылі проці пабудовы панцырнага крэйсэра

Застацца на міністэрскіх пасадах—галоўная задача лідэраў сац.-дэмакратаў.

БЭРЛІН, 28-5. Пасьля справаздачы ЦК зьезд сацыял-дэмакратаў заслухаў даклады аб партыйна-асьветнай працы, аб працы сярод жанчын і справаздачу кантрольнае камісіі. У апазіцыйнай крытыцы кааліцыйнай палітыкі зусім адсутнічаў прынцыповы напрамак. Апазіцыя выказвала толькі небясьпеку, што кааліцыйная палітыка, як яна ажыцьцяўляецца Мюльлерам, Зэвэрынгам і Вісэлем, можа пашкодзіць палітычнаму ўплыву сацыял-дэмакратычнай партыі на тых рабочых, якія пя ідуць яшчэ за сацыял-дэмакратамі, і што яна не дае волі манэўраваньню партыі ў адносінах да камуністаў.

У адказ апазіцыйным прамоўцам выступіў з вялікай прамовай рэйхсканцлер Мюльлер, які пераважна, **супярэчыў проці прапановы Кюнстлера і Літке аб тым, каб міністры сацыял-дэмакраты разам з усёй сацыял-дэмакратычнай фракцыяй рэйхстагу галасавалі проці чарговага асыгнаваньня на пабудову панцырнага крэйсэра.**

«Мне ніколі ня прыходзіла на думку—сказаў Мюльлер—**гаварыць выбаршчыкам,** што панцырны крэйсэр ня будзе будавацца. Калі з-за пытаньня аб крэйсэры сацыял-дэмакратычная партыя сарве сучасны ўрад, дык яна гэтым зробіць сябе сьмешнаю. Магчыма, што ад сусьветнае вайны можна было-б і ўхіліцца, калі-б Амстэрдамскі кангрэс 2-га Інтэрнацыяналу ў 1904 годзе не забараніў Жорэсу ўвайсьці ў склад тагочаснага французскага ўраду, і калі-б імпэратарская Нямеччына ня трымала сацыял-дэмакратыю далёка ад ураду. Мюльлер востра крытыкаваў таксама заяву апазіцыйнага дэлегата Экштэйна аб тым, што «сацыял-дэмакратыя адказвае не за ўсю дзяржаву, а толькі за рабочую клясу». Водлуг слоў Мюльлера, гэта заява „зьяўляецца аплявухаю таму, што сацыял-дэмакратыя казала і рабіла на працягу апошніх 10 гадоў".

Пасьля Мюльлера з заключным словам выступіў дакладчык ЦК Фогель, які заявіў: **«Калі будзе ўхвалена прапанова Кюнстлера і Літке, дык сацыял-дэмакратычная партыя ўжо заўтра ня будзе ўдзельнічаць ва ўрадзе. Хто не жадае, каб сацыял-дэмакраты вышлі з ураду ў сучасны момант, той павінен галасаваць за прапанову ЦК.** Зьезд большасьцю 256 проці 138 галасоў ухваліў пастанову ЦК аб звычайным пераходзе да чарговых спраў бяз ніякіх рэзалюцый на прапановы наконт пытаньня аб кааліцыі з буржуазнымі партыямі і па пытаньні аб пабудове панцырнага крэйсэра.

Заклік першамайскага камітэту ў Бэрліне

БЭРЛІН 27-У. Першамайскі камітэт Бэрліну (які складаецца з прадстаўнікоў рабочых буйных прадпрыёмстваў і левых пралетарскіх арганізацый) зьвярнуўся да працоўных Бэрліну з заклікам пасьпяшацца з адлічэньнямі ў фонд дапамогі пацярпеўшым у выніку першамайскіх падзей. Збор сродкаў праводзіцца МОПР'ам і Міжрабпомам. Патрэбны буйныя сумы, бо лік рабочых, звольненых за ўдзел у першамайскіх выступленьнях, вялікі. За апошнія дні Міжрабпом выдаў дапамогу 210 звольненым тытунёўцам.

РЭФАРМІСТЫ ЦЕРПЯЦЬ ПАРАЖЭНЬНІ НА САМЫХ БУЙНЫХ ПРАДПРЫЁМСТВАХ.

БЭРЛІН, 27-У. На перавыбарах фабкому на буйным мэталёвым прадпрыёмстве Бэргмана ў Бэрліне сьпіс рэвалюцыйнага крыла прафсаюзаў атрымаў 2.105 галасоў; рэфармісты атрымалі 1.008 галасоў. Такім парадкам рэвалюцыйнае крыло атрымала дзьве трэці мандатаў у фабкоме проці паловы ў ранейшым складзе.

НОВАЕ ВЫКРЫВАНЬНЕ ШПІЁНСКАЕ ДЗЕЙНАСЬЦІ ПРОЦІ СССР.

БЭРЛІН, 25-У, „Ротэ Фанэ» ў апошнім сваім нумары перад новаю забаронаю ня спыняе выкрываньня аб разьведчым апараце нямецкага вайсковага міністэрства і камісарыяту грамадзкага парадку. Як паведамляе газэта, адным з галоўных кіраўнікоў агульнага разьведчага апарату абедзьвюх устаноў зьяўляецца нейкісьці Лямацан, які наладзіў шчыльныя зносіны з ангельскаю разьведкаю і спэцыялізаваўся ў галіне шпіянажу проці СССР. «Ротэ Фанэ» зазначае, што сацыял-дэмакратычным міністрам на гэты раз ня ўдасца адгаварыцца „няведаньнем справы». Ужо 15 месяцаў назад камуністычныя дэпутаты рэйхстагу падалі запытаньне вайсковаму міністру Грэнэру наконт гэтага.

Франка-польскі ваенны дагавор пацьвярджаецца.

БЭРЛІН, 28-5. „Кельнішэ Цэйтунг" паведамляе, што паведамленьне маскоўскага нямецкага штотыднёвіка «Москауэр Рундшау» аб сакрэтным ваенным дагаворы паміж Польшчай і Францыяй не пакідае ніякіх сумненьняў, бо гэты дагавор зьяўляецца фактам. Водлуг слоў газэты, агалошаны зараз тэкст дагавору не зьмяшчае нічога нечаканага. Гэты дагавор, водлуг слоў „Кельнішэ Цэйтунг", супярэчыць духу пакту Келёга і ў яшчэ большай ступені—Літвінаўскага пратаколу.

Ці зробяць французскі і польскі ўрады адпаведныя вывады з выкрыцьця і ці анулююць яны гэты ваенны дагавор, у гэтым, водлуг слоў газэты, можна сумнявацца. Наадварот, будзе цудам, калі Францыя і Польшча не адновяць гэты дагавор пасьля сканчэньня яго моцы ў 1932 г.

Вобыск у Харбінскім генэральным консульстве

МАСКВА, 29-У. Згодна неправераных яшчэ вестак, якія атрыманы вакольным шляхам, кітайская ўлада ў Харбіне зрабіла вобыск у генэральным консульстве СССР. Па тых-жа вестках, ніхто з супрацоўнікаў не арыштаваны. Весткі правяраюцца.

У Саюзе ССР.

Страхаваньне пасеваў ад неўраджаю.

МАСКВА, 28-5. Пад старшынствам Наркома фінансаў СССР т. Бруханава адбылася ў Крамлі нарада дэлегатаў Усесаюзнага Зьезду Саветаў па пытаньні аб страхаваньні пасеваў ад неўраджаю. Бруханаў, адчыняючы нараду, зазначыў, што ў СССР у сучасны момант ёсьць страхаваньне пасеваў ад градабіцьця, вымачак і вымярзаньня. Наркамфін СССР падаў ва ўрадавыя органы праэкт закону аб страхаваньні пасеваў ад неўраджаю, які зьяўляецца вынікам ня толькі градабіцьця, вымачак і вымярзаньня, але і іншых стыхійных навал. Праэкт закону ўстанаўляе розныя нормы забясьпекі і выплат для асобных раёнаў СССР у залежнасьці ад таго, наколькі яны церпяць засуху і іншыя стыхійныя няшчасьці, што зьяўляюцца прычынамі неўраджаю.

Падрабязны даклад аб значэньні страхаваньня пасеваў ад неўраджаю зрабіў Серабракоў, які зазначыў, што пасевы страхуюцца ня поўнасьцю, а толькі ў разьмеры, які забясьпечвае сялянскаму двару пэўны прыбытак, які дае магчымасьць аднавіць гаспадарку.

Страхаваньне будзе абавязковым для ўсіх гаспадарак. Бядняцкія гаспадаркі будуць вызвалены ад платы. Увядзеньне страхаваньня ад неўраджаю мае на мэце надаць сялянскай гаспадарцы большую трываласьць і незалежнасьць ад уплыву стыхійных навал.

Па дакладу разгарнуліся жвавыя спрэчкі. Дэлегаты прызналі выданьне закону аб страхаваньні ад неўраджаю сваечасовым і дадалі да яго некалькі паправак.

Т. Бруханаў у сваім заключным слове паведаміў, што ў першую чаргу страхаваньне будзе распаўсюджана на ўсе яравыя збожжавыя пасевы (жыта, пшаніца, авёс, ячмень, проса і грэчка), а пасьля паступова і на іншыя культуры.

Паведамленьне заводу „Коммунар".

МАСКВА, 28-У. ЦК УсеКП(б) атрымаў ад рабочых і служачых заводу „Коммунар" (Запарожжа) такое паведамленьне: **„Завадзкая вытворчая канфэрэнцыя ад імя 3.600 рабочых, інжынэраў, тэхнікаў і служачых заводу „Коммунар" на Запарожжы, падпісваючы дагавор на сацыялістычнае спаборніцтва з 3-ма заводамі Запарожжа і Любарэцкім, дае партыі, у асобе яе Ленінскага ЦК, сваё пралетарскае слова мабілізаваць усе свае сілы на сацыялістычную перабудову народнае гаспадаркі. Ажыцьцяўляючы на сваім заводзе 1-га студзеня 7-мігадзінны дзень працы, мы за першыя паўгодкі 1928-29 году павялічылі прадукцыйнасьць працы на 18,8 проц. Але гэтага яшчэ мала. Мы абавязваемся да канца 1928-29 году выканаць прамфінплян з усімі яго эканамічнымі паказчыкамі і лічым іх мінімумам».**

Новы атрад пралетарскіх журналістаў

МАСКВА, 28-У. Учора адбыўся ўрачысты выпуск курсантаў Дзяржаўнага Інстытуту Журналістыкі. На сходзе прысутнічалі т. т.: Яраслаўскі, Крыніцкі, Інгулаў, Фэлікс Кон, Домбаль, Лазьян, Бруно, Ясенскі і інш.

Рэктар Дзяржаўнага Інстытуту Журналістыкі т. Розанаў паведаміў, што Дзяржаўны Інстытут Журналістыкі выпушчае 56 чалавек, з іх 40 па асаўным 3-хгадовым курсу і 16—па 2-хгадовым—рэдактарскім. Большасьць выпушчаных накіроўваецца ў п а ін-цыю на рэдакцыйную працу. З зак-і-каю прамоваю аб задачах друку выступіў загадчык АПДА ЦК УсеКП(б) т. Крыніцкі. З прывітаньнем ад ЦК УсеКП(б) і „Праўды" выступіў таз. Яраслаўскі

Вынікі пераходу на 7-мігадзінны дзень.

МАСКВА, 28-5. Прэзыдыум ВСНГ РСФСР заслухаў даклад аб выніках працы на прадпрыёмствах, якія перайшлі на 7-мігадзінны дзень. Выпуск прадукцыі на прадпрыёмствах, якія працуюць 7 гадзін, павялічыўся. Такі рост паказвае тэкстыльная прамысловасьць на 11,6 проц., кравецкая—на 36,5 проц. і гарбарная—на 43,3 пр. Такія-ж добрыя вынікі ёсьць і ў галіне прадукцыйнасьці працы.

За што арыштаваны рэдактар „Юманітэ"

Французскі ўрад абараняе фашызм.

ПАРЫЖ, 28-5. Водлуг паведамленьня „Юманітэ", арыштаваны рэдактар замежнага аддзелу гэтай газэты абвінавачваецца ў напісаньні артыкулу ў „Юманітэ" аб небясьпецы, якая пагражае жыцьцю італьянскага камуніста Тэрачыні, зьняволенага ў катаржнай турме ў Сан-Стэфана.

Судовае прасьледваньне супроць Пэры ўзбуджана з прычыны пратэсту італьянскага пасольства за наступны сказ: «барацьба са злачынствам фашызму гэта ёсьць барацьба супроць вайны, якая ўтвараецца па той бок Альп, дзе забіваюць лепшых таварышоў. Трэба ўспомніць, што ў Парыжы ёсьць пасольства, якое таксама адказна за праліцьцё крыві, якое падрыхтоўваецца»

„Юманітэ» даводзіць, што тое, што было напісана Пэры аб італьянскім пасольстве, пісалі сотні раз дзесяткі буржуазных газэт бяскарна.

Аднаачасова з Пэры быў арыштаваны адказны рэдактар „Юманітэ» Русо, які быў на гэтым пасту ўсяго 19 гадзін. Ён абвінавачваецца за артыкул, які заклікае салдат адзначыць гадавіну расстрэлу камунараў—братаньнем з парыскім пралетарыятам і ўзмоцненай барацьбой за салдацкія патрабаваньні.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

Братаньне польскай улады з грузінскімі контр-рэвалюцыянэрамі.

У Варшаве адбыўся ўрачысты сход, арганізаваны грузінскай эміграцыяй. На маніфэстацыі грузінскай эміграцыі прысутнічалі афіцыйныя прадстаўнікі польскай улады. Шэраг польскіх газэт прысьвяцілі артыкулы гэтаму сходу.

«Кур'ер Поранны» з гэтага повада гаворыць, што бакінска-батумскі нафтаправод праз некаторы час зробіцца кабелем, які будзе злучаць шляхі Каўказу і Эўропы».

Абгаварваючы тэлеграму, «Известия» пішуць: „Мы рэгіструем новы факт нелёяльнасьці польскай улады ў адносінах да Савецкага Саюзу. Польская ўлада падтрымлівае ўсякія контр-рэвалюцыйныя авантурныя элемэнты, якія рэвалюцыяй выкінуты за межы СССР. У „гостеприимной" Польшчы знашлі цёплы прытулак усе галіны эміграцыі, пачынаючы ад рускіх манархістаў і канчаючы грузінскімі меншавікамі. З апошнімі польская ўлада ўжо з даўняга часу знаходзіцца ў «деловом» кантакце.

Даволі ўспомніць дзейнасьць былога польскага пасланьніка ў Ангоры-Кноля, працэс агента 2-га аддзелу польскага гэнштабу Паложнага, які арыштаваны польскай уладай пры пераходзе савюзна-польскай мяжы супольна з групай грузінскіх меншавікоў, што накіроўваліся для контр-рэвалюцыйнай шпіёнскай працы ў СССР. Грузінскія меншавікі, якія маюць вялікія сувязі з польскай разьведкай, цяпер, калі афіцэры 2-га аддзелу занялі кіраўнічыя пасты, апынуліся ў блізкіх адносінах з высокімі польскімі саноўнікамі.

Зьяўляючыся новым довадам польскай нелёяльнасьці, відавочнае братаньне польскай улады з грузінскімі контр-рэвалюцыянэрамі высьвятляе таксама, у якой меры палітыка Польшчы падпарадкавана чужаземным уплывам".

Пяты дзень галадуюць палітвязьні на Лукішках

ВІЛЬНЯ 29-5. Абвешчаная ў суботу галадоўка пратэсту прыняла зацяжны характар. Палітзьняволеныя катэгарычна адмаўляюцца прымаць яду. Усе трымаюцца цьвёрда і надзвычайна дысцыплінавана.

Да пракурора зьвярнуўся доктар Выгодзкі і запрапанаваў сваё „пасрэдніцтва" паміж палітзьняволенымі і турэмнай адміністрацыяй.

Пракурор адмовіў у просьбе Выгодзкага, спасылаючыся на тое, што галадоўка нібы ўзьнікла ня з прычын турэмнай адміністрацыі, а па „загаду" „пыртыі".

(*„Кур'ер Віленскі"*).

4 гады катаргі за патрабаваньне амністыі.

ВІЛЬНЯ, 29-У. Віленскі акруговы суд разглядаў справу Шуф'яна. Яго суд абвінавачвае ў тым, што ён у 1928 годзе вывесіў **чырвоны сьцяг** з надпісам: Прэч з фашыстаўскай амністыяй, жадаем вызваленьня ўсіх вязьняў палітычных".

Суд прызнаў, што ўчынак Шуф'яна мае антыдзяржаўны характар і прыгаварыў яго на 4 гады катаргі. Справа разьбіралася пры зачыненых дзьвярох.

40.000 бяспрытульных у Польшчы.

ВАРШАВА. Зараз у Варшаве налічваецца каля 1000 сем'яў, якія пазбаўлены прытулку. Частка з іх павінна туліцца ў стайнях і пунях; частка застаецца пад адкрытым небам. У апошні час лік бяспрытульных значна павялічыўся. Дамаўласьнікі распачалі высяленьне з кватэр па старых прыгаворах суду, якія ня былі раней выкананы з прычыны зімніх халадоў.

Згодна папярэдніх статыстычных даных, у сучасны момант па ўсёй Польшчы налічваецца каля 40000 бяспрытульных, выкінутых з кватэр па прыгаворах суду. Новы наступ дамаўласьнікаў на кватарантаў надзвычайна абвастрыў становішча. Варшаўскае гарадзкое самакіраўніцтва сьцьвярджае, што ў яго няма грошай для пабудовы дамоў для бяспрытульных. Аб дапамозе бяспрытульным з боку правінцыяльных гарадоў і гаварыць ня прыходзіцца. (ТАСС).

„Непакояць" юга-слаўскага караля.

ВЕНА, 25-5. З Загрэбу паведамляюць, што ў пятніцу „невядомыя асобы" выбухам дынаміту папсавалі чыгуначны мост між Загрэбам і Шыфакам па лініі Белград-Загрэб. Цяпер нельга праехаць па чыгунцы да пелацу Драшковіца (каля Загрэбу), дзе павінен быў жыць юга-слаўскі кароль у часе яго прыезду ў Загрэб. Гэта ўжо другі замах у раёне Загрэбу на працягу апошняга месяца. Паліцыя мяркуе, што мэта замаху—не дапусьціць праезду караля ў Загрэб.

За выразную клясавую лінію кампартыі на выбарах.

ПАРЫЖ, 26-5. Камуністычны друк паведамляе пра некаторыя выпадкі перабльітваньня тактыкі «клясы проці клясы» на нядаўніх муніцыпальных выбарах у Эльзасе і Лётарынгіі. Кіраўнікі камуністычнае арганізацыі ў Лётарынгіі, не зважаючы на ўхваленыя на апошнім зьезьдзе партыі пастановы, утварылі для другога туру выбарчы блёк з сацыялістамі і гэтак званаю „дэмакратычнаю групаю», якая на справе зьяўляецца, як выявілася пазьней, буржуазнай прадпрыёмчай групоўкай.

Кіраўніцтва камуністычнае партыі зараз-жа зьвярнула ўвагу мясцовай арганізацыі на немагчымасьць сумясьціць такую тактыку з генэральнай лініяй партыі. Мясцовая партыйная арганізацыя безагаворачна зганьбіла ўтвораны мясцовымі кіраўнікамі апартуністычны блёк і ў ухваленай рэзалюцыі даручыла ўсім членам арганізацыі растлумачыць рабочым масам заблытаную грубую палітычную памылку, пацьвярджаючы і абараняючы правільнасьць лініі ЦК.

Аднаачасова арганізацыя ўхваліла выключыць з партыі членаў арганізацыі, адказных за пераблытаньне генэральнае лініі партыі. Як паведамляе «Юманітэ», палітбюро зацьвердзіла ўсе гэтыя пастановы, якія падлягаюць яшчэ зацьверджаньню пленуму ЦК партыі.

„Сацыялісты" Францыі трацяць выбаршчыкаў.

ПАРЫЖ, 27-У. На выбарах у генэральную раду дэпартаманту Сэны з 40 дарадчыкаў у першым туры абрана: 5 камуністаў, 2 фрасараўцы, 5 сацыялістаў, 2 незалежныя сацыялісты, 1 рэспубліканскі сацыяліст, 7 умераных рэспубліканцаў, блізкіх да рэспубліканскай левай і 1 правы (рэспубліканска-дэмакратычны саюз), а разам—22 кандыдаты. Перагаласаваньню падлягае 17 кандыдатаў. У склад ранейшае генэральнае рады ўваходзіла 6 камуністаў, 3 фрасараўцы, 11 сацыялістаў, 5 незалежных сацыялістаў, 3 рэспубліканскія сацыялісты, 11 сяброў радыкальнае левае і 1 правы. **Пакуль што самыя значныя страты пацярпелі сацыялісты. Камуністы-ж ужо ў першым туры правялі 5 сваіх кандыдатаў.** Можна чакаць, што агульны лік камуністычных дарадчыкаў пасьля другога туру перасягне ранейшы ўзровень. Выбары ў дэпартамант Сэны зьяўляюцца сканчэньнем выбараў у генэральныя рады, якія адбываліся ў 1928 г.

Пэрлы французскае „дэмакратыі".

ПАРЫЖ 27-У. Згодна загаду прэфэкта Пэрпіняна, **замест распушчанага** дэкрэтам камуністычнага муніцыпалітэту ў Рыўсальце, кіраваньне гарадзкімі справамі часова даручана спэцыяльнай дэлегацыі пад старшынствам Парэса, які ў часе муніцыпальных выбараў быў **на чале антыкамуністычнае** кааліцыі, пераможанай на выбарах камуністамі. Гэтая дэлегацыя будзе кіраваць перавыбарамі муніцыпалітэтаў, назначанымі на 9-га чэрвеня.

Нажым на спажыўца ў Італіі.

РЫМ, 24-У. Мыта на прывозную пшаніцу, павялічаная летась увосень з 27 лір да 40 за квінтал, ізноў павялічваецца да 51 ліры. Такое павялічэньне мыты ўжо другі раз азначае для спажыўца дадатковы выдатак у 600 міліёнаў лір. Цана на італьянскую пшаніцу таксама павінна павялічыцца, як маркуюць эканамісты, у размеры паловы мыты. Спажыўцу гэта дае новы выдатак больш, як у 600 міліёнаў лір.

Кампартыя на выбарах у ангельскі парлямант.

ЛЁНДАН. Кампартыя высоўвае на ўсеагульных выбарах 25 кандыдатаў. Упяршыню камуністычная партыя выступае, як самастойная палітычная сіла, незалежна ад рабочае партыі. Кандыдаты рабочае партыі высоўваюцца проці камуністаў ва ўсіх 25 выпадках. Сур'ёзная барацьба разгорнецца ў Сіхем-Харборы, дзе камуніст **Гары-Політ**, вельмі папулярны сярод рабочых, выступае проці Макданальда. **Ва Ўсходняй Рондзе, Артур Хорнэр,** камуніст-гарняк выступае проці Уотса Маргана, рэфармісцкага чыноўніка з фэдэрацыі гарнякоў Паўднёвага Уэльсу.

У прымежных з Рондаю выбарчых акругах камуніст **Кемпбэль** выступае проці Хартсхорна, а камуніст Вільсон—проці Маргана Джэнса.

Проці Саймона, які належыць да лібэральнае партыі, выступае **Шаўкат Усмані**, адзін з ліку 31 лідэраў індыйскіх прафсаюзаў, што знаходзяцца ў зьняволеньні. Як вядома, Саймон адмовіўся падтрымаць хадайніцтва аб вызваленьні Усмані.

У Шатляндзкіх выбарчых акругах камуністычныя кандыдаты выступаюць проці членаў рабочае партыі, якія зьяўляюцца членамі апошняга парляманту ў 4-х раёнах. **Саклатвала** выступае ў паўночным Бэтэрсі, ад якога ён абраны быў у апошні парлямант. Але той раз Саклатвала ня меў проці сябе кандыдата з рабочае партыі, а зараз ёсьць.

Далей, проці членаў рабочае партыі, якія былі дэпутатамі апошняга парляманту, выступае шэраг камуністаў.

Ангельская дыктатура ў Індыі.

БЭРЛІН, 26-У. Як паведамляе бамбэйскі карэспандэнт «Бэрлінэр Тагеблят», віцэ-кароль Індыі прадоўжыў тэрмін паўнамоцтваў заканадаўчага збору на невядомы час.

Барацьба рабочых за мяжой.

Жыцьцю таварыша Тэрачыні пагражае небясьпека.

БЭРЛІН, 27-5. Як паведамляюць з Нэапаля, **жыцьцю таварыша Тэрачыні пагражае небясьпека.** Ён харкае крывёй і зьнясілены так, **што турэмная адміністрацыя павінна была перавесьці яго ў турэмную больніцу. Але-ж улада адмовілася перавесьці Тэрачыні ў больніцу** і замест гэтага, пераслала яго ў канцыю на Флёрэнцыю.

Ёсьць небясьпека, што пасьля „врачебного осмотра" ў Флёрэнцыі, Тэрачыні будзе накіраван назад, што будзе пагрозаю для яго жыцьця.

Бастуе 2500 дрэваапрацовачнікаў у Парыжы.

ПАРЫЖ, 25-5. Забастоўка дрэваапрацовачнікаў Парыскага раёну ўсё больш пашыраецца. Забастоўка выклікана тым, што рабочыя прад'явілі прадпрыёмствам **патрабаваньні, выпрацаваныя кангрэсам французскіх фабзавкомаў.** Агульная колькасьць бастуючых дрэваапрацовачнікаў дасягае 2500.

Батракі трымаюцца моцна.

ПАРЫЖ, 24-5. Забастоўка ў Комарго (на поўдні Францыі), **(якая ахапіла каля трох тысяч сельска-гаспадарчых рабочых, не аслабляецца.** «Юманітэ» паведамляе, што па меры росту стачачнага руху павялічваюцца і палітычныя рэпрэсіі.

Бэрлінскі суд выгараджвае забойцаў Лібкнэхта і Розы Люксэмбург.

БЭРЛІН, 25-У. Пракурор бэрлінскага акруговага суду адмовіўся ўзбудзіць прасьледваньне супроць пракурора Іерэса, які ў свой час, калі кіраваў сьледзтвам па справе забойства К. Лібкнэхта і Розы Люксэмбург, старуўся выгарадзіць забойцаў. Адмова тлумачыцца тым, што дзеяньне Іерэса пакрываецца даўнасьцю і абвешчанымі з таго часу амністыямі. Левая газэта „Вэльт ам Абэнд" падкрэслівае, што галоўная прычына адмовы—гэта страх перад далейшымі выяўленьнямі, да якіх прывёў-бы працэс Іерэса.

Перамога сельска-гаспадарчых рабочых.

ПРАГА, 28-У. Забастоўка сельска-гаспадарчых рабочых у Чэхаславакіі канчаецца з частковым **посьпехам для рабочых.** У некаторых раёнах рабочыя дабіліся падвышэньня зарплаты да 25 проц.

Камуністы патрабуюць амністыі палітычным зьняволеным.

ПАРЫЖ. На другі дзень пасьля свайго пераабраньня камуністычны муніцыпалітэт Бабіньні ўхваліў дамагацца амністыі палітычным зьняволеным. У Алюэне пры абраньні камуністычнага муніцыпалітэту фашысты ўчынялі хуліганскія выбрыкі. Рабочыя адказалі на гэта стыхійным мітынгам у чэсьць новага муніцыпалітэту.

Голас рэвалюцыянэра з турмы.

ЛЁНДАН, 28-У. Орган левага крыла ангельскага рабочага руху „Сэндэй-Уоркер" друкуе адкрыты ліст індускага рэвалюцыянэра Шаўкат Усмані. Шаўкат Усмані—у міруцкай турме і вызначан камуністычнай партыяй кандыдатам на выбарах супроць кандыдатуры вядомага лібэрала Саймона. Саймон—старшыня ўрадавай камісіі па пераглядду індыйскай канстытуцыі. Ліст Усмана востра крытыкуе палітыку Саймона.

На палёх СССР.

Стан пасеваў на Паўночным Каўказе.

*РАСТОЎ н-Д., 24-5. Пасеўны плян у 11 саўгасах Паўночнага Каўказу выканан з **перавышэньнем** на 6 проц.: замест намечаных да засеву 15230 гэктараў засеяна 16160. Сяўба, за выключэньнем 2 саўгасаў, скончана раней вызначанага тэрміну. Надвор'е па ўсёй краіне для пасеваў спрыяючае. На поўначы краіны і ў большай частцы Кубані стан пасеваў добры, у астатніх акругах—зусім здавальняючы. Азімыя на поўначы выходзяць у трубку, на поўдні—пачалі красаваць. Яравыя ўсюды гусьцяцца. Падсонечнік пачаў разрастацца, стан яго добры. Вясеньняя сяўба скончана ва ўсёй краіне. Ідзе заворка і баранаваньне папараў.*

Збожжатрэст засноўвае новыя саўгасы-волаты.

МАСКВА, 28-5. На пасяджэньні камісіі Савету Працы і Абароны па будаўніцтву было заслухана паведамленьне Збожжатрэсту аб праграме будаўніцтва ў саўгасах трэсту на бягучы год. Сёлета трэст павінен заснаваць 44 буйныя саўгасы, пераважна ў Сярэднім і Ніжня-Волскім краі. У наступным годзе мяркуецца заснаваць 110-112 саўгасаў.

На Збожжатрэст ускладаецца таксама заснаваньне ў 1930 годзе сеткі трактарных станцый. Камісія адзначыла, што Збожжатрэст правёў за кароткі даволі час вялікую арганізацыйную і падрыхтоўчую працу.

Значная вынаходка.

ХАРКАЎ, 27-5. У гутарцы з супрацоўнікам Ратау вынаходца бульбасаджалкі т. Павух зазначыў, між іншым: «Мая саджалка пакарочвае працэс пасадкі. Пасадка бульбы на абшары ў 1 гэктар каштуе звычайна 31 р. 45 кап., а карыстаньне маёю бульбасаджалкаю дасьць магчымасьць зьменшыць гэты выдатак да 2 р. 25 кап. Такім парадкам, эканомія на адным гэктары складае 29 р. 20 кап. Сёлета ўвосень будуць ужыты практычныя захады, каб наладзіць масавы выраб бульбасаджалак (на адным з заводаў Укртрэстсельмашу".

За сацыялістычную перабудову вёскі, за ўздым ураджайнасьці.

Шырокім фронтам у сацыялістычнае спаборніцтва.

Усе спэцыялісты с-г—у сацыялістычнае спаборніцтва.

Шырокая хваля сацыялістычнага спаборніцтва, якая з кожным днём захапляе ўсё новыя і новыя вучасткі нашага сацыялістычнага будаўніцтва, зразумела, не магла не захапіць і працоўных сельскай і лясной гаспадаркі.

Якую ролю павінны адыграць у гэтым спаборніцтве **нашы аграномы і с-г спэцыялісты?** Іх роля вялікая. Хто, як не агроном, як не спэцыяліст с-г павінен зьявіцца першым ініцыятарам арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва? Хто, як не спэцыялісты павінны практычна дапамагчы арганізаваць масы? Наогул, нельга сабе ўявіць цяпер агранома і спэцыяліста, які застаўся-б у баку і ня прыняў ніякага ўдзелу ў правядзеньні сацыялістычнага спаборніцтва. Але гэтым роля аграномаў і спэцыялістаў ні ў якім разе ня можа абмежавацца. Неабходна, каб самі аграномы і спэцыялістыя ўступілі ў сацыялістычнае спаборніцтва паміж сабой.

У аснову гэтага спаборніцтва павінны быць пакладзены наступныя задачы.

На аграўчастках, у аграрайёнах і акругах у першую чаргу неабходна паставіць задачы палепшаньня агранамічнай дапамогі сялянству, асабліва па арганізацыі і абслугоўваньню калгасаў і вытворчых с-г аб'яднаньняў, правядзеньня мерапрыёмстваў па падвышэньню ўраджайнасьці, рэарганізацыі сялянскай гаспадаркі, абслугоўваньню асобных галін яе, плянавасьці і канкрэтызацыі ў працы спэцыялістых.

У спаборніцтва могуць уступаць як асобныя аграпрацаўнікі, якія працуюць у розных вучастках (падрайёны), таксама спаборніцтва можа праводзіцца і паміж цэлымі групамі аграпэрсаналу.

Формай для ўступленьня ў спаборніцтва, як вядома, зьяўляюцца асобныя дагаворы. Дзеля чаго складаецца апісаньне пастаўленых задач і вызываецца другі адпаведны аграўчастак, аграрайён, акруга і г. д. Дагаворы падпісваюцца кожным аграпрацаўніком, які ўступае ў спаборніцтва і зьяўляюцца абавязковымі для выкананьня. У справе разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва павінна быць праяўлена шырокая ініцыятыва саміх працаўнікоў.

Трэба памятаць, што сацыялістычнае спаборніцтва не павінна быць толькі простым конкурсам выпярэдніцтвам, а павінна зьявіцца адным з магутных спосабаў лепшай арганізацыі працы, ўзаемнай дапамогі адстаўшым вучасткам нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

ЦП саюзу СГЛР, ставячы гэтае пытаньне перад усімі працоўнымі саюзу, асабліва заклікае ўсіх аграномаў і ўсіх спэцыялістаў с-г. аб уступленьні ў сацыялістычнае спаборніцтва. Мясцовым сэкцыйным органам трэба зараз-жа неадкладна шырока разгарнуць гэтую працу па практычнаму ажыцьцяўленьню яе на мясцох. Трэба паставіць і ажыцьцявіць лёзунг „няма агранома і спэцыяліста які-б ня ўдзельнічаў у сацыялістычным спаборніцтве".

ЦБ АГРАСЭКЦЫІ.

Разгорнем сацыялістычнае спаборніцтва ў сельскай гаспадарцы.

Прызыў партыі—за сацыялістычную арганізацыю працы на прадпрыёмствах, за ўзорную, сапраўды рэвалюцыйную вытворчасьць на заводах і фабрыках, за зьніжэньне сабекошту прадукцыі, за ўзьняцьце працоўнай дысцыпліны—атрымаў належны водгук сярод рабочай масы, разбудзіў сярод іх лепшыя інстынкты клясы—будаўніка і кіраўніка пралетарскай дзяржавы, выклікаў энтузіязм, захопленасьць вырашэньнем задач сацыялістычнага спаборніцтва.

Калі мы можам ужо канстатаваць дасягненьні ў прамысловасьці, якія выкліканы сацыялістычным спаборніцтвам, то ў сельскай гаспадарцы магутны вытворчы ўздым працоўных мас яшчэ не распачаўся. Сацыялістычнаму спаборніцтву ў сельскай гаспадарцы не аддана належная ўвага нізавымі партыйнымі арганізацыямі і нізавымі савецкімі органамі, з прычыны чаго рабочыя савгасаў, калгасьнікі, камунары, працоўнае сялянства ў шмат якіх мясцох ня ведаюць аб задачах і мэтах спаборніцтва.

Асабліва, як гэта выявілася на нарадзе ў ЦК КП(б)Б, нядбайна аднесьліся да справы разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва Белсельсаюз, Калгассаюз, Цэнтральны малочны саюз, Белсельбанк і шэраг іншых цэнтральных установаў, якія па сутнасьці павінны былі зьявіцца застрэльшчыкамі ў гэтай вялізарнейшай палітычна-гаспадарчай працы.

Сацыялістычнае спаборніцтва ў сельскай гаспадарцы трэба шырока разгарнуць. Гэтага вымагае ўвесь ход рэканструкцыйна - перабудоўчага працэсу нашай гаспадаркі. Трэба мабілізаваць грамадзкую думку навокал гэтага вельмі важнага гаспадарча-палітычнага мерапрыёмства; трэба разгарнуць самадзейнасьць і ініцыятыву рабочых савгасаў, калгасьнікаў, працаўнікоў камун, працоўнага сялянства ў справе лепшай арганізацыі працы, узьняцьця вытворчасьці прадукцыі, узьняцьця ўраджайнасьці, зьніжэньня сабекошту, ажыцьцяўленьня агранамічных мерапрыёмстваў, а галоўнае ў справе сацыялістычнай перабудовы вёскі на аснове аграмаджаньня працы, калектывізацыі індывідуальных гаспадарак.

Райкомы КП(б)Б, ячэйкі, РВК, сельсаветы, аграномы і, наогул усе спэцыялісты сельскай і лясной гаспадаркі, вясковыя настаўнікі, хатнікі павінны разьвіць максымум энэргіі і ініцыятывы па сацыялістычнаму спаборніцтву ў сельскай гаспадарцы. З свайго боку цэнтральныя ўстановы, як Наркамзем, Бельсельбанк, Белсельсаюз, Калгассаюз. Цэнтральны малочны саюз, КСУ, Белкаапсаюз, саюз працаўнікоў зямлі і лесу—павінны тэрмінова распрацаваць канкрэтныя мерапрыёмствы і па сваёй лініі даць указаньні, у чым і як павінны выяўляцца праца нізавых органаў гэтых установаў па разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва ў сельскай гаспадарцы.

Зразумела, што справе разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва ў сельскай гаспадарцы павінны дапамагчы рабочыя арганізацыі і шэфтаварыствы гораду. Гэта будзе лепшаю формаю змычкі працоўных гораду з бядняцка-серадняцкім сялянствам вёскі і з вясковым пралетарыятам.

Сацыялістычнае спаборніцтва ні ў якім разе нельга абюракрачваць, уціскаць у рамкі, праводзіць па «дырэктывах». Менш усяго трэба парадансьці, траскатні, больш ініцыятывы і самадзейнасьці мас.

Трэба ня толькі разгарнуць спаборніцтва, але і наладзіць сыстэматычную праверку яго выкананьня. **Я. М.**

Сацыялістычнае спаборніцтва і задачы асеньняй с.-г. кампаніі ў савгасах.

Вясеньняя пасеўкампанія падыходзіць к канцу. Папярэднія вынікі падрыхтоўкі сьведчаць аб значных посьпехах у выкананьні задач, пастаўленых перад савгасамі партыяй і ўрадам.

У паход за ўраджай савгасы вышлі з большай колькасьцю штучных угнаеньняў на 40 проц. у параўнаньні з мінулым годам. Сабралі 1090 тон попелу. Засяваюць авёс і ячмень гатунковым насеньнем.

У большай меры рыхтуюцца скарыстоўваць вынікі прац дасьледчых станцый і шырэй непасрэдна яе разгарнуць у савгасах. Пачаў працаваць беларускі «Гігант» на балоце—савгас «імя дзесяцігодзьдзя БССР». Непараўнальна з мінулым разгарнулася агравытворчая дапамога бядняцка-серадняцкаму сялянству. Савгасы перадалі с-г. каапэрацыі і абмянялі насельніцтву 5220 тон гатунковага і палепшанага насеньня.

Арганізаваны 33 рамонтныя майстэрні ў савгасах, якія адрамантавалі 1500 шт. сялянскага інвэнтару. Працуюць цэнтральная і перасоўачная трактарныя майстэрні На злучных пунктах працуе 136 вытворнікаў-жарабкоў, 270 быкоў і 146 кныроў. Адсартавана 10.530 тон сялянскага насеньня, амаль у тры разы больш гадавой нагрузкі 1928 г. Праведзена 690 сялянскіх сходаў па пытаньнях узьняцця ўраджайнасьці.

Ажывілася праца вытворчых нарад у савгасах.

Аднак, праверка падрыхтоўкі выявіла шмат савгасаў, якія ня вытрымалі экзамена.

Асноўным рашаючым вынікам зьяўляецца актыўнасьць удзелу і кантролю з боку саміх мас рабочых. Там, дзе актыўна працавалі вытворчыя нарады, дзе самаахвярна разам усе ажыцьцяўлялі мерапрыёмствы, там ёсьць буйнешыя посьпехі.

Улічваючы недахопы вясеньняй пасеўкампаніі—безадкладна трэба рыхтавацца да асеньняй сяўбы. Пад гатунковыя пасевы трэба заняць увесь азімы клін 7794 гэктары, замест 2250 (павялічэньне на 70 проц.), пашырыць пасеў пшаніцы з 296 да 500 гэк. і павялічыць на 71 гэктар засеў азімай вікі. Забясьпечыць уздым ураджайнасьці на 18 проц. у параўнаньні з запраэктаваным на 1929 г. і зьнізіць сабекошт прадукцыі ня менш як на 15 проц. Ужыць шэраг мер да палепшаньня жывёлагадоўлі (квашэньне корму, палепшаньне сенажацяй і інш.).

Пашырыць дапамогу і ўплыў савгасаў на вёсцы. Своечасова і добра правесьці збор ураджаю і, нарэшце—падрыхтоўку да вясеньняй сельска-гаспадарчай кампаніі 1930 г.

Узьняцце ўраджайнасьці забясьпечваецца пашырэньнем амаль у два разы штучных люпінавых і торфавых угнаеньняў, гатунковых пасеваў, лепшай апрацоўкай глебы.

Ад своечасовага збору ўраджаю і абмалоту яго залежыць ня толькі своечасовая сяўба ў савгасах, а і перадача насельніцтву 2400 тон гатунковага і палепшанага жыта.

Намечаныя па пляну да арганізацыі 80 вытворчых аб'яднаньняў і ўзмацненьне савгасаў, ачыстка 3500 тон сялянскага збожжа, рамонт 1500 шт. інвэнтару, водпуск у карыстаньне інвэнтару савгасаў, апрацоўка глебы бяднейшаму сялянству—патрабуе бездакладнага агравытворчага шэфства над т-вамі, пасёлкамі, вёскамі, растлумачэньня і арганізацыі практычнага выкананьня гэтых задач.

Сацыялістычнае спаборніцтва павінна дапамагчы ажыцьцёвіць мерапрыёмствы росту таварнасьці калгасаў, уздыму ўраджайнасьці і сацыялістычнай перабудовы вёскі.

А.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Меншчына выклікае на сацыялістычнае спаборніцтва Гомельшчыну.

Працаўнікі і спэцыялісты сельскай і лясной гаспадаркі і с-г. каапэрацыі Меншчыны 29-га мая пастанавілі выклікаць на сацыялістычнае спаборніцтва ва ўсіх галінах сельскай і лясной гаспадаркі і с-г. каапэрацыі працаўнікоў і спэцыялістаў Гомельшчыны.

Паміж гэтымі акругамі будзе заключана ўмова.

Электрыфікацыя вёскі.

Нядаўна на прэзыдыуме РВК быў разгледжан плян электрыфікацыі Шклоўскага раёну.

Згодна гэтага пляну, усе вёскі, а асабліва камуны, калгасы і арцелі, будуць атрымоўваць электраэнэргію з Асінстрою.

Энэргіяй ня толькі будуць асьветлены вёскі, але яе скарыстаюць сяляне для руху машын.

Прыблізна на кожны двор мяркуецца правесьці дзьве лямпачкі, а па жаданьні і больш.

Плата за лямпачку—30 кап. у месяц і 15 рублёў праводка ў растэрміноўку на тры гады.

Сялянства вельмі здаволена і з прыемнасьцю запісвае па дзьве, тры лямпачкі на двор.

Р. Хвойна.

Кулакі на лаўцы падсудных.

Мазыр, 29-V. На днях у Мазырскім Акрсудзе пачаўся вялікі працэс па справе земляўпарадкаваньня ў Тураўскім раёне.

Ужо некалькі год вялзецца гэта земляўпарадкаваньне ў вёсках Запясочча і Верасеніца. Усе пляны былі ўжо даўно зацьверджаны належнымі органамі, і калі была праведзена абрэзка і прырэзка зямлі пачалі супроцьдзейнічаць заможныя сяляне, ад якіх належала забраць частку лішняй зямлі.

Яны адкрыта пашлі супроць гэтага.

Напісалі ліст да ўраду БССР, але апошні пацьвердзіў пастанову мясцовых земорганаў. Тады нездаволеныя земляўпарадкаваньнем рашылі іншым спосабам адпомсьціць. Аднойчы, калі беднякі павінны былі ўжо перасяліцца на прырэзаную ім зямлю, група заможнікаў падпаліла будынкі некалькіх беднякоў.

Па справе выклікана 40 чалавек сьведак. На лаўцы падсудных—звыш 10 чалавек.

М. Г.

Трэба прыцягнуць да адказнасьці.

Два месяцы таму назад у газэце „Савецкая Беларусь" была надрукавана заметка аб тым, што Танескае мэліарацыйнае таварыства ўжо болей двух гадоў ня можа дачакацца адводу мяжы паміж балотам Данілевіцкага л-ва і балотам таварыства, на якім праводзіцца мэліарацыя. З прычыны гэтай валакіты сарваны плян працы мэліарацыйнага т-ва.

Але мазырскія чыноўнікі і да гэтага часу ня хочуць нічога рабіць, каб упарадкаваць справу.

На днях адбыліся перавыбары праўленьня Танескага мэліарацыйнага таварыства. На перавыбарах сяляне выказалі абурэньне, што да гэтага часу нельга дачакацца канца валакіце па адводу мяжы.

Трэба сказаць, што яшчэ ў Мазырскім АКРЗА сядзяць валакітчыкі. Трэба вінаватых прыцягнуць да адказнасьці. Гр-не сяла Танежы спадзяюцца, што «Савецкая Беларусь» ім дапаможа ў гэтай справе. **С. Шоўкавіч.**

Недахоп бульбы.

ВОРША, 29-5. Загатоўка бульбы для прамысловасьці і для патрэб насельніцтва праходзіць зусім нездавальняюча. Да гэтага часу, па ўсёй Аршанскай акрузе загатоўлена бульбы толькі 7300 тон, замест вызначаных па пляну 25.646; гэта значыць, што плян выкананы толькі на 28 проц.

Улічваючы гэта, акрвыканком запрапанаваў усім сельсаветам і райвыканкомам прыняць усе захады да стварэньня на месцы спрыяючых умоў для загатоўкі бульбы.

Акрсельсаюзу і Дняпросаюзу запрапанавана ўжыць усе магчымыя захады, каб загатоўку бульбы павесьці фарсыраваным шляхам і неаслабна сачыць за сваім загатоўчым апаратам. Заводы, у сваю чаргу, павінны будуць таксама выканаць заданьні па загатоўках і даць насеньне для кантрактоўшчыкаў у гэтым годзе.

Акрсельсаюзу запрапанавана прыцягнуць да адказнасьці старшыню Якаўлеўскага сельска-гаспадарчага таварыства за вываз бульбы за межы акругі.

Расьце і мацнее.

Сучаснае становішча савгасу „Чырвоны Прафінтэрн", Самахвалавіцкага р-ну (Меншчына), у параўнаньні са становішчам 1921 году, значна палепшылася. Савгас сапраўды зьяўляецца прыкладнай гаспадаркай, якая робіць уплыў на аграмаджаньне сялянскіх гаспадарак.

Сёлета савгас мае 35 добрых рабочых коняй—супроць 12 у 1921 г. Савгас набыў 2 новыя статкі кароў: 33 штукі дацкага гатунку (удой 22-24 літры) і некалькі штук чырвона-нямецкага гатунку (удой 18-20 літраў у суткі). Ёсьць 40 шт. гатунковых цялят.

Гаспадарка машынізавана цалкам, у тым ліку ёсьць 2 трактары.

Ураджаі савгасу: аўса—100 пуд. з гэктара; ячменю—91 пуд.; жыта—80 пуд., бульбы—да 100 пуд. Севазварот у савгасе 11-цiпольны. Сялянству ў гэтым годзе савгас абмяняў 3000 пуд. чыстагатунковага насеньня і ачысьціў на машынах савгасу 7000 пуд.

Культурна-бытавыя ўмовы рабочых забясьпечаны поўнасьцю.

К. Макарэвіч.

Аграмінімум праводзім у жыцьцё.

Ворша, 29-V. Сяляне Шапкаўскага сельсавету, Аршанскага раёну, якія пры земляўпарадкаваньні перайшлі на пасёлкі, прынялі пастановы аб агранамічным мінімуме якія зараз праводзяць у жыцьцё. Большасьць пасёлкаў перайшлі на шматпольле; зьбіралі і скарысталі ў якасьці ўгнаеньня попел, баранавалі жыта і забаранялі пасьбу скаціны на лугох.

А. К.

Ткацкія курсы ў Магілеве.

Акруговы Інспэктарыят Нарасьветы прыступае да абсталяваньня ткацкіх курсаў для дэклясаванай яўрэйскай моладзі.

Курсы ўтвараюцца па ініцыятыве АЗЕТ'у, ахопяць яны 45 падросткаў.

На правядзеньне курсаў арыентыровачна вызначана 12800 руб.

У якасьці выкладчыкаў запрошаны выдатныя спэцыялісты.

Тэрмін навучаньня на курсах—паўтара гады.

Юр.

Фэльетон.

ГАРОШКА З ПЯЧАТКАЙ.

Гарошка—старшыня рабачкому савгасу «Бярэзіна».

Гэта ня жарты! „Бярэзіна"—фабрыка хлеба, а Гарошка—на чале...

Нават і пячатка свая ёсьць.

Калі прафсаюзы—школа камунізму, дык Гарошка—«настаўнік» у гэтай школе, выхаваўца новай грамады.

Яго ня трэба вучыць самога.

Гарошка ведае сутнасьць новага выхаваньня... Ды як ведае!

У гр. Чыжэўскага Андрэя нарадзіўся новы чалавек... Віноўнік нараджэньня ідзе да Гарошкі.

— Так што, тав. Гарошка, дачка нарадзілася...

— У каго? У цябе? Дачка? Значыцца, новая... новы чалавек... Віншую!

Трэба замачыць абноўку, каб швы не разыходзіліся...

— Замачыць, зразумела, трэба, але чым?.. Хлебнай ніяк не дастанеш...

— Ну, кінь!.. Што-ж гэта за хрэсьбіны будуць, калі бяз гэтага?.. Ой, ці бацька ты сваей дачкі?

— Не жартуйце, тав. Гарошка... Лепш дапаможэце...

І Гарошка дапамагае. Ён выдае «доверенность»:

«Дана настоящая доверенность от рабочкома совхоза Березино в том, что в Чижевского Андрея действительно народилась дочь, на что он нуждается в русской горькой (хлебном вине), в чем удостоверяется.

Предрабочкома совхоза

Березино: Горошко С.».

А зьнізу—пячатка савгасу.

„Доверенность" заслугоўвае пячаткі і па стылі і па зьмесьце.

Прыклаўшы руку і пячатку, Гарошка, напэўна, яшчэ раз павіншаваў шчасьлівага айца і, трэба думаць, з павагай выслухаў запрашэньне:

— Дык прыходзьце, тав. Гарошка... Ашчасьліўце...

Ці пойдзе старшыня рабачкому Гарошка на хрэсьбіны?.. Ой, павінен пайсьці... Дзе-ж ён дзенецца?!

Трэба толькі пажадаць, каб былі „вясёлыя" хрэсьбіны.

Каб гэта, значыцца, сьпяваліся песьні, былі скокі... Каб кум палаяўся з суседам, і каб бабы адна ў другой за валасы патрымаліся, каб адным словам... „на здароўе"...

Ня шкодзіла-б і Гарошку атрымаць адпаведную пашану і падзяку... Ну, скажам, ліхтар да вока і ...ус паўзвода зубоў.

Няхай бы гэта была „пячатка" за савгаскую пячатку і тую вялікую выхаваўчую працу, якую ён праводзіць пры дапамозе „хлебнай"...

Ёсьць чаму павучыцца ў Гарошкі! Дый вучацца каму трэба. Сэкратар Бярэзінскага сельсавету Баразна выдаў за пячаткай з гэрбам пасьведчаньне другому Баразьне аб тым, што таксама на хрэсьбіны трэба адпусьціць гарэлкі...

Цікава было-б прасачыць—вось к... гэтыя дзьве Баразны пасьля хрэсьбін будуць ляжаць бяз ног у трэцяй „баразьне" пад плотам—ці ня будзе там разам з імі і Гарошка...

Можа, там лёгка было-б забраць у яго пячатку савгасу і яшчэ якія-небудзь дакументы...

Паўлюк Шчамель.

Глускі РВК ашуквае савецкую грамадзкасьць.

(Ад нашага карэспандэнта).

Так ужо налаўчыўся Глускі райвыканком адказваць на селькораўскія допісы, якія прысылаюцца рэдакцыямі газэты на дасьледаваньне, што проста любата. У дваццаць чатыры хвіліны адказ гатоў. І які яшчэ адказ! Дыплёматычны...

Фармальны з усіх бакоў.

З практычнай установкаю і ўсім, чым хочаш.

Глускі райвыканком не затрымае адказу. Раз—і гатоў адказ.

Возьмем прыклад: Былі ў Жолвінцы настаўнікі. Кепскія настаўнікі давялі школу да поўнага развалу. Мясцовыя органы патрэбавалі зьняць настаўнікаў з працы. Селькор напісаў у газэту і... як маланкай спаліць—адказ:

— Настаўнікі Барысік і Кіркевіч пераведзены ў другую школу.

Газэта дапамагла! Радуецца селькор.

А сяляне ходзяць хмурыя. Праходзіць месяц—настаўнікі сядзяць на сваім месцы наседжаным. Праходзіць два, тры, пяць, сем месяцаў, а настаўнікі і ня рушацца з месца.

А райвыканком ухмыляецца:

— І ваўкі сыты (значыць, і газэце заткнулі рот), і козы (значыць, настаўнікі) цэлы.

Толькі тады райвыканком зьняў настаўнікаў, калі ўжо сялянства падняло цэлы бунт, і справа была перададзена пракурору.

Але і пасьля гэтага Глускі райвыканком свайго „очковтирательства" ня кінуў.

Скардзіліся сяляне вёскі Жолвінец, што з прычыны таго, што млын райвыканкому ня спушчае вады (спушчае толькі 2 месяцы ў лета), сяляне вёсак застаюцца бяз сена.

Калі трэба касіць, запруць ваду—паплыло сена.

Усе газэты сьпісалі сяляне. Нават скардзіліся ў Бабруйскую РСІ.

РСІ патрабавала адказу ад райвыканкому. Што адказаў райвыканком, відаць з наступнага:

«На допіс Бабруйская РСІ паведамляе, што вада спушчаецца на працягу 4 месяцаў, што дае магчымасьць скасіць сена «Сав. Бел.» ад 26-II № 45).

Ну, чаго-ж болей трэба? Выходзіць, газэта дапамагла.

Але пачакайце радавацца! Гэта таксама «очковтирательство». Вада і ня думала спушчацца на 4 месяцы. Наадварот, млын 23 красавіка 1929 г. атрымаў прапанову за № 3682:

„Рабіць спуск вады ў працягу двух месяцаў (з 15 чэрвеня **да** 15 жніўня)».

І цікавей за ўсё тое, што Глускі райвыканком толькі два-тры дні таму назад ставіў гэта пытаньне на прэзыдыуме, канчаткова яго ня вырашыў, а яшчэ ў лютым даў адказ, што вада спушчаецца.

Дзівяцца сяляне. Бяруцца за галаву і ніяк ня могуць уцяміць.

— Ды што-ж гэта такое: абман, ашуканства, ці што іншае?

У прыведзеным вышэй нумары газэты «Сав. Беларусь» мы знаходзім і адказ, з якога відаць, што сяляне вёскі Жолвінец, арганізаваныя ў арцель возчыкаў пры селькоме, прэтэндуюць на 25 проц. скідкі па сельска-гаспадарчым падатку.

Райвыканком адказвае, што скідка ім не палагаецца з тае прычыны, што арцель арганізавалася позна і нічога не зарабіла, і даход яе ня ўключан у аб'екты па падатку.

—Як гэта так,—дзівяцца сяляне, сябры арцелі.—У кожнага з нас (а сяброў арцелі звыш 50) пазапісвалі ў падатак даход ад арцельных заработкаў, а скідкі няма.

Тут таксама „очковтирательство".

Можна было-б прывесьці яшчэ шэраг фактаў такога злоснага ігнараваньня селькораўскімі заметкамі, такога заядлага ашукваньня савецкай грамадзкасьці і друку Глускім райвыканкомам.

Глускі райвыканком захварэў на гэту хваробу і, здаецца, хранічна. Напляваўцельскія адносіны да селькораўскіх заметак, да крытыкі зьнізу праяўляюцца ва ўсю. Гэтую хваробу трэба вырваць з карэньнем; **„неабходна ва ўсіх выпадках сыстэматычнага ігнараваньня рабселькораўскіх заметак вінаватых прыцягваць да судовай адказнасьці, як за злачынствы».** (З пастановы прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б).

Выпаўненьне гэтай пастановы будзе найлепшым лякарствам для бюракратаў з Глускага райвыканкому.

А. Дамброўскі.

Шырэй сацыялістычнае спаборніцтва паміж савгасамі і калгасамі.

„Забясьпечваючы буйны рост індустрыі, усё больш разгортваючы рэканструкцыю сельскай гаспадаркі, наступаючы на кулака і нэпмана, мы павінны ў кароткі адносна тэрмін дагнаць і перагнаць капіталістычныя краіны» (з адозвы 16 партканф. да ўсіх рабочых і працоўнага сялянства). 16 партыйная канфэрэнцыя прыняла пяцігадовы плян, які зьяўляецца канкрэтнай праграмай партыі і будаўніцтва сацыялізму.

Без актыўнага самаахвярнага ўдзелу шырокіх мас пасьпяхова гэтыя задачы выканаць немагчыма. Рабочая кляса ў адказ на сучасныя цяжкасьці і як пацьвярджэньне гатоўнасьці выканаць вялікі плян грандыёзных рэканструкцыйных задач уступіла ў сацыялістычнае спаборніцтва.

Ва ўсіх кутках Савецкага Саюзу, дзе на сацыялістычны лад перабудоўваецца наша сучаснасьць, моцна ўздымаюцца хвалі творчай ініцыятывы тысяч рабочых, якія дабраахвотна бяруцца за ліквідаваньне асноўных цяжкасьцяй нашага часу. Сацыялістычнае спаборніцтва — магутны сродак, лепшая падстава для выкананьня пяцігадовага пляну, і гэта важнейшая палітычная і эканамічная задача—рычаг гэраічнага ўздыму творчасьці мас на дапамогу сацыялістычнаму будаўніцтву.

Усьлед за фабрыкамі і заводамі ўздымаюцца першыя хвалі сацыялістычнага спаборніцтва ў вёсцы. Ужо першыя весткі гавораць аб тым, што дзесяткі савгасаў і калгасаў уступілі ў спаборніцтва паміж сабою, што мы знаходзімся напярэдадні шырокага разгортваньня спаборніцтва ў вёсцы. Савгасы Івань, Рачкавічы, Дабрынь, Барысаўшчына, Бабінічы і інш. першыя зрабілі пачатак.

Савецкія гаспадаркі прайшлі аднаўленчы пэрыяд. Толькі за апошнія тры гады вырас асноўны капітал з 7028 тысяч рублёў да 12040 тысяч рублёў, з 5640 тысяч рублёў да 10950 тысяч рублёў вырасла валавая і з 3264 да 6365 руб.—таварная прадукцыя савгасаў. Сетка заводаў для апрацоўкі бульбы і малака ў масла і сыр павялічылася з 60 да 93. Паляпшаюцца ўмовы працы рабочых; узрастае агра-вытворчая дапамога савгасаў у вёсцы. Аднак, трэба выразна і цьвёрда сказаць, што сёнешняе становішча і праца савгасаў не адпавядае ўсім запатрабаваньням, якія ўскладзены на іх партыяй і ўрадам у часе рашучай сацыялістычнай рэканструкцыі ўсяе гаспадаркі. Аб гэтым сьведчыць наступнае:

Дробнасьць значнага ліку старых савгасаў і слабая забясьпечанасьць асноўнымі сродкамі вытворчасьці, асабліва прадукцыйнай жывёлай (32 проц. пляну), нізкая тэхніка, малая ўраджайнасьць і ўдойнасьць; недапушчальна слабое выкарыстаньне вынікаў працы дасьледчых станцый; высокі сярэдні сабекошт прадукцыі (цэнтнэр жыта—7 р. 43 кап., пшаніцы—9 руб. 81 кап., аўса—8 руб. 24 кап., ячменю 8 руб.) па асобных гаспадарках дасягае вельмі высокіх разьмераў (Цяцерына—12 р. 81 кап. цэнт. жыта, Харопуць—13 р. 76 кап. цэнтн. аўса, Дурынічы—14,55 руб. цэнтн. ячменю). Наколькі дрэнна пастаўлена арганізацыя працы, прывяду такі факт. Савгас Вязынь-Фаніналь у 1928 годзе траціў на адзін гэктар культуры бульбы 61,1 чалавека-дзён, яго сусед Ружамполь—42,8, а «вучоны» Лазінскі ў Закружжы здавальняўся тым, што падзённы рабочы выбіраў 10 пуд. бульбы ў дзень. Ёсьць шэраг недахопаў у прамысловым, гаспадарчым і жыльлёвым будаўніцтве. Савгасы яшчэ слаба выконваюць сваю ролю пралетарскіх цэнтраў па агравытворчай перабудове бядняцка-серадняцкага сялянства на шляху яго аграмаджаньня. Агульныя выдаткі на працу складаюць 34 проц. ад сумы ўсіх выдаткаў. Павышэньне вытворчасьці і якасьці працы, побач са ўзьняцьцем вытворчасьці ўсіх галін—найбольш рэальны крок зьніжэньня сабекошту. Аднак, сёньня ў большасьці савгасаў яшчэ нізкая вытворчасьць і якасьць працы, асабліва падзённых рабочых, малая нагрузка працоўнага дня. Дрэннае выкарыстоўваньне цягавай сілы і складаных машын. Нізкая вытворчая кваліфікацыя рабочых і інш.

Рэканструкцыя ўсяе сельскае гаспадаркі патрабуе ад савгасаў новых задач і максымальных тэмпаў у іх ажыцьцяўленьні.

Савгасы па справе павінны стаць энэргетычнымі базамі і базамі сельска-гаспадарчай індустрыялізацыі. Савгасы павінны яшчэ больш узмацніць і палепшыць вытворчасьць гатунковага насеньня і племяннога матар'ялу, аднача́сова стаўшы сапраўднымі фабрыкамі прадуктаў спажываньня (буйныя малочныя фэрмы і гародныя гаспадаркі каля гарадоў).

Грунтуючыся на гэтым, савгасы, як пралетарскія базы, могуць і павінны быць цэнтрамі непасрэднай калектывізацыі і вытворчага каапэраваньня сялянства. За пяцігодку мы павінны пабудаваць на 50000 гэктараў новыя буйныя савецкія гаспадаркі—на балоце.

Да канца пяцігодкі валавая прадукцыя павінна вырасьці да 32133 тысяч, а таварная—да 21818 тысяч р. Асноўныя капіталы вырастуць да 27388 тысяч. У будаўніцтва савгасаў прадугледжваецца ўкласьці 21347 тысяч руб.

Гэта асноўныя задачы, пастаўленыя перад савгасамі партыяй і ўрадам. Сацыялістычнае спаборніцтва—на службу гэтым задачам. Іх выкананьне патрабуе самаахвярнай працы ўсяго рабочага калектыву—ад броні да кіраўніка савгасаў.

Аднак, рашаючым фактам зьяўляецца задача аб'яднаньня вакол грандыёзных пэрспэктыў творчай энэргіі ўсіх рабочых, партыйных, прафсаюзных, савецкіх і грамадзкіх арганізацый—усёй савецкай грамадзкасьці.

Трэба цьвёрда падкрэсьліць, што спаборніцтва—гэта не чарговая кампанія, а што гэта мэтад працы масамі, пры дапамозе якога мы зможам поўна выкарыстаць здольнасьці і энэргію ўсіх рабочых, шырокі выхад творчай энэргіі мас, узмацнім самакрытыку зьнізу. Спаборніцтва стане адным з асноўным мэтадаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Усямерна разгортваючы тэмп спаборніцтва, трэба рашуча ўстрымацца ад паказной параднасьці і шуміхі. Менш урачыстых пасяджэньняў, нарад, агульных дэклярацый.

Патрэбна дакладнае арганізаванае кіраваньне ўсё ўзрастаючымі хвалямі пераклічак, накіроўваючы рэвалюцыйны энтузіязм і творчую энэргію мас па лініях асноўных задач. Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі павінны наладзіць гэта кіраваньне і кантроль. Павінны быць узяты пад увагу ўзьняцьце ўраджайнасьці, удойнасьці, зьніжэньне сабекошту прадукцыі, узьняцьце вытворчасьці і якасьці працы, працоўнай дысцыпліны, зьніжэньне накладных выдаткаў, поўная мабілізацыя мясцовых рэсурсаў для разьвіцьця вытворчасьці ўсіх галін, выкананьне ўсіх мерапрыёмстваў па асеньняй сельска-гаспадарчай кампаніі, калектывізацыі, каапэраваньні і разьвіцьці вытворчасьці бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Нядбайным і нядобрасумленным адносінам да цягавай сілы, машын, жывёлы, прагулам самі рабочыя павінны супроцьпаставіць лепшыя прыклады сацыялістычнай дысцыпліны, арганізуючы ў патрэбных выпадках ударныя брыгады для выкананьня ўзятых абавязкаў у часе спаборніцтва.

Ужо зараз вызначаецца слабы ўдзел у разгортваньні спаборніцтва ўпаўнаважаных трэсту і кіраўнікоў савгасаў. Прафсаюзныя і гаспадарчыя органы павінны лічыць гэту працу найвялікшай. Трэба катэгарычна асудзіць настрой асобных таварышоў, якія выказваюцца за апаратнае рэгуляваньне тэмпу спаборніцтва—замест яго ўсямернага разьвязваньня.

Конкурс на лепшае правядзеньне вясеньняй пасеўнай кампаніі ў савгасах, як частка сацыялістычнага спаборніцтва, павінен выклікаць з боку кіраўнікоў савгасаў, прафсаюзных арганізацый на мясцох і ўсёй грамадзкасьці больш увагі. Сацыялістычнае спаборніцтва ў яго канкрэтных абавязках павінна прадугледжваць навукова-абгрунтаваныя магчымасьці выкананьня ўсіх мерапрыёмстваў і шляхі іх выкананьня.

Сацыялістычны сэктар павінен стаць прыкладам умелага сацыялістычнага спаборніцтва, павінен быць арганізатарам і кіраўніком гэтага руху на вёсцы.

Зразумела, што сацыялістычная рэканструкцыя са ўсімі яе дэталямі з посьпехам пройдзе пры ўмове, калі максымальна будуць выкарыстаны мясцовыя сродкі, творчая энэргія тысяч батракоў, калгасьнікаў, калі будзе разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва цэлых вёсак, с-с., райёнаў.

Разгортваючы сацыялістычнае спаборніцтва, мы можам ад яго чакаць толькі аднаго: ня пустой формы бяз зьместу, **а сыстэматычнага здаровага росту вытворчасьці, больш хуткага выкананьня** задач, ускладзеных партыяй і ўрадам.

Усе, як адзін, на сацыялістычнае спаборніцтва!

Т. Аўчыньнікаў.

Калгас, а не пасёлкі.

(Рагачэўскі р., Бабруйскай акругі).

Пры земляўпарадкаваньні в. Н.-Сербранкі ў мінулым годзе быў арганізован калгас „Серабранка" з 8-мі гаспадарак.

Кулакі і падкулачнікі ўсімі мерамі імкнуліся сарваць добры пачатак, але перадавікі сяляне-беднякі і серадлякі ўбачылі на практыцы, што не прашло і году, як калгас ужо набыў малатарню, саламарэзку, сеялку, 4 добрых коняй, 4 добрых на жалезным хаду калёс, добрыя плугі, бароны і інш. Праца ў калгасе праходзіць дружна і старанна.

Сяляне пасялкоўцы, пераканаўшыся ў карысьці калгаснага будаўніцтва, пастанавілі на сходзе прасіць РВК узбуйніць стары калгас, прылучыўшы да яго зямлю пасёлку. РВК у згодзе з акрземаддзелам дапамог сялянам і задаволіў іх просьбу.

У калгас прынята 22 новыя гаспадары. Цяпер калгас складаецца з 30 гаспадарак амаль паловы вёскі, якім прыпадзе да 400 гэкт. зямлі.

Узбуйнены калгас прыняў устаў з правам выхаду, але без выдзяленьня зямлі. Неадкладваючы ніводнага дня, калгасьнікі зрабілі ацэнку насеньня, коняй і с.-г. інвэнтару і што лепшае аддалі ў лік паю ў калектыўнае карыстаньне. Такім чынам, калгас ужо мае: коняй 24 шт., калёс на жалезным хаду добрых 12, параконных плугоў 18, барон простых жалезных і трохпласьцінных 40.

У самым хуткім часе будуць куплены іншыя с.-г. машыны як; трактар, жняяркі, касілкі і г. д. Х зіме мяркуецца пабудаваць агульныя хлявы, сенавалы, лазьню, гумны, клюб, перанесьці ў калгас школу, пабудаваць у працягу году млын і засадзіць сад.

13 мая ўсе сяляне новага калгасу ў першы раз выехалі на поле і дружна прыступілі да працы. Засеяна ў калгасе будзе: бульбы 50 гэкт., аўса 45, лубіну 10, ячменю 5, лёну 4, пшаніцы 1 гэкт. і грэчкі 5, усяго 120 гэкт. Уборка жыта таксама будзе калектыўная.

У чэрвені-ж м-цы землямер канчаткова ўкажа межы калгасу, і з васеньняга пасеву ўжо будзе ўводзіцца правільны многапольны севазварот.

У вёсцы наступіла сапраўдная сельска-гаспадарчая і культурная рэвалюцыя. Калгасьнікі з вялікім энтузіязмам, поўны радасьці, спакойна, бяз супярэчаньняў абмяркоўваюць с.-г. справы, будуюць пляны шпаркага ўздыму сельскае гаспадаркі.

Старыкі кажуць: «Раней ня ўмелі мы жыць, такі калгас трэба было арганізаваць зараз-жа пасьля рэвалюцыі".

Гэты калгас у Рагачэўскім р. зьяўляецца самым буйным і з самымі лепшымі ўмовамі і пэрспэктывамі на далейшае разьвіцьцё. Самі сяляне кажуць: «Мы пастараемся наладзіць гаспадарку нашага калгасу так, каб зрабіць яго прыкладным сярод другіх калгасаў».

Так сяляне пачынаюць разумець і будаваць сваю сацыялістычную гаспадарку.

Бандарук

УЗМАЦНЯЙ АБАРОНУ СССР.

Выхад Чырвонай арміі ў лягэры—чарговы крок па ўзмацненьню абароназдольнасьці краіны.

НАПЯРЭДАДНІ ЛЯГЕРНАЙ ВУЧОБЫ.

Дарога з Менску ў лягеры прапушчае ўсё новыя і новыя фурманкі з маёмасьцю.

Тут і фурманкі з цывікамі, фанэраю і іншымі будаўнічымі матэр'ялямі, фурманкі МЦРК з хлебам, калбасою і г. д.

Будуецца лягер, бо праз тыдзень—упартая лягерная вучоба.

А будаваць ёсьць шмат чаго. Трэба пабудаваць новыя палаткі, ленінскія домікі і ўсё гэта—з дрэва, усё робіцца грунтоўна, моцна, каб ня будаваць кожны год.

Тэмп будаўніцтва вельмі шпаркі, гэта ўбачаць працоўныя Менску, якія прыдуць у лягеры, у прыватнасьці, на адчыненьне лягераў, якое хутка адбудзецца.

Але ўжо пачынаюць клапаціцца аб якасьці вучобы, і каб яна прайшла добра—выклікаюць на спаборніцтва іншыя часьці Беларускай акругі.

№ полк Беларускае дывізіі пасылае дэлегацыю ў Бабруйск з выклікам:

— Дамо ў канцы летняй вучобы 80 проц. выкананьня стральбы.

— Хто лепей вывучыць пастановы XVI партканфэрэнцыі.

— Узмацнім дысцыпліну.

Так пішуць байцы ў сваім выкліку; у палку часьці падпісалі дагавор паміж батальёнамі.

Ужо падрыхтавана і ажыцьцяўляецца культурнае абслугоўваньне байца.

Кожны месяц у лягерах будзе 6 кіносэансаў і 4 пастаноўкі, адну з якіх дае Рабіс, а іншыя—рабочыя клюбы г. Менску.

1 чэрвеня лягер ачысьціцца і будзе чакаць працоўных г. Менску на адчыненьне, якое адбудзецца, па думцы палітаддзелу, 2 чэрвеня.

Чырвонаармейцы чакаюць шэфаў, каб паказаць свае дасягненьні. С. К.

ЧАРГОВЫ КРОК ПА ШЛЯХУ РАЗВЯЗВАНЬНЯ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ПЫТАНЬНЯ.

Рэвалюцыйны Вайсковы Савет і ЦК Кампартыі (б) Беларусі ўхвалілі плян беларусізацыі № Самарскай стралковай дывізіі. Пастанова, ухваленая без ніякіх адзнак урачыстасьці, зацьверджаная між іншымі вялікімі пытаньнямі разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва, мае вялікае палітычнае значэньне. Яна яшчэ раз падкрэсьлівае, што толькі „перамога Саветаў і ўтварэньне дыктатуры пралетарыяту зьяўляецца асноўнай умовай зьнішчэньня нацыянальнага ўціску, утварэньня нацыянальнае роўнасьці, забясьпечаньня правоў нацыянальных меншасьцяй“ (з разалюцыі X зьезду РКП(б) пра нац. пытаньне). Беларускія нацыянал-фашысты тыпу Луцкевіча і Астроўскага ня хочуць зразумець гэтага, даводзячы, што вызваленьне беларускіх працоўных мас можа быць зроблена рукамі памешчыкаў і фабрыкантаў, што саюз Беларусі з іншымі савецкімі рэспублікамі паслабляе яе „незалежнасьць“ і дае толькі „шыльдавую“ беларусізацыю. Няхай паспрабуюць гэтыя марыянэткі дэфэнзывы здабыць ад сваіх мэцэнатаў накшталт пана Кіртыкліса, віленскага віцэ-ваяводы, хоць-бы тысячную долю таго, што ў нас зроблена ў справе вырашэньня нацпытаньня. Працоўныя масы Заходняй Беларусі поўнасьцю ацэняць довады нацыянал-фашыстаў і практычную працу рабочае клясы і камуністычнай партыі і пойдуць за апошняй.

Ёсьць і другі вялікі сэнс беларусізацыі дывізіі. № Самарская беларуская дывізія—частка Рабоча-Сялянскай Чырвонай арміі, якая працуе на роднай мове чырвонаармейца, улічвае пры яго вайсковым і палітычным выхаваньні ўсе асаблівасьці Беларусі, дзякуючы чаму яшчэ з большым посьпехам узмацняе баяздольнасьць СССР, яшчэ з большым посьпехам будзе рыхтаваць з чырвонаармейцаў як загартаваных абаронцаў сацыялістычнага будаўніцтва, так і сьвядомых удзельнікаў яго.

Плян беларусізацыі разьлічаны на два з паловаю гады, пачынаючы з 1 мая г. г. У першы год начальніцкі склад дывізіі вывучае беларускую мову і беларускія статуты; пераводзіцца на беларускую мову ўсё баявое і палітычнае выхаваньне курсантаў палкавых школ; уводзіцца часткова беларуская мова ў іншыя галіны вайсковага жыцьця. На другі год плянам прадугледжана перавесьці на беларускую мову ўсю працу на зборах навабранцаў, на агульных зборах, а таксама і ўсю палітычную і партыйную работу. У апошнія шэсьць месяцаў пераходзяць на беларускую мову навучаньне і праца з кадрамі, уся паміжзборавая праца і апараты дывізіі.

Спрыяючымі ўмовамі беларусізацыі зьяўляецца наяўнасьць сярод начальніцкага складу № Самарскай беларускай дывізіі 63 проц. беларусаў, вопыт беларусізацыі № Беларускай імя Фрунзэ дывізіі і тое, што некаторая праца (частка палітычных заняткаў, агульна-адукацыйныя заняткі і інш.) ужо вядуцца на беларускай мове.

Ня трэба замоўчваць вачэй, нават трэба добра ўявіць цяжкасьці, якія, зразумела, будуць у справе беларусізацыі. Перш за ўсё праявы вялікадзяржаўнага і беларускага шавінізму, якія ня толькі будуць перашкаджаць практычнай працы, але зьбіваць беларусізацыю ў шкодны палітычны бок, не на шлях інтэрнацыянальнага выхаваньня чырвонаармейца, а ўскладненьня нацыянальных суадносін. Значную цяжкасьць складае аўладаньне мовою тэй часткай начскладу, які не паходзіць з Беларусі ці даўно парваў з ёю сувязь. Вывучэньне мовы, гісторыі, геаграфіі і інш. павялічыць нагрузку камандзіра і палітпрацаўніка. Будзе адбівацца і недахоп беларускай вайсковай літаратуры.

Але палітычны апарат і партыйная арганізацыя Самарскай беларускай дывізіі поўнасьцю ўяўляюць як неабходнасьць беларусізацыі, так і ўсіх перашкод, што з яе вынікаюць. Бальшавіцкая згуртаванасьць партарганізацыі, вопыт, які яна мае ў галіне вайсковага будаўніцтва, забясьпечваюць выкананьне і гэтай новай для яе працы. Выканае свае абавязкі і начальніцкі склад дывізіі, які няраз даводзіў сваю здольнасьць праводзіць ў жыцьцё лёзунгі ўлады і партыі.

Пры ўсім гэтым беларуская Самарская дывізія патрабуе і павінна атрымаць маральную і матэр'яльную дапамогу з боку грамадзкіх арганізацый, з боку пралетарскае грамадзкасьці наогул. Гэта дапамога ня можа абмежавацца толькі арганізацыямі раёну камплектаваньня дывізіі, бо беларусізацыя дывізіі ёсьць акцыя агульна-беларускага значэньня. Моц Чырвонай арміі менавіта ў тым, што яна шчыльна зьвязана са ўсёй рабочай клясай савецкае краіны, з самымі шырокімі коламі пралетар[illegible]мадзкасьці, што ва ўсіх сваіх [illegible] яна заўсёды мае поўную дапамогу і падтрыманьне. А. САМАХВАЛАЎ.

На вайсковую вучобу.

Іх адразу можна было пазнаць, як людзей на гэтай мясцовасьці. З клумкамі за плячыма хлопцы ідуць, пытаюцца пра штаб № стралковага палка. Збор пераменнага складу назначан на 13 мая, і яны зьявіліся на дзень раней.

— Раней заўсёды лепш, трэба адпачыць трохі, а потым з сьвежымі сіламі за працу,—адказвалі навабранцы на запытаньне кадравых чырвонаармейцаў.

На заўтра раніцою на плошчы туды-сюды шнуравалі такія-ж вясковыя хлопцы з клумкамі, але ў значна большай колькасьці.

Чырвонаармейцы хадзілі вакол іх прыглядаючыся, ці ня знойдуць знаёмага твару, а некаторыя ўжо абменьваліся сваімі думкамі.

На сьценах будынкаў вывешана аб'ява куды каму зьяўляцца. Пачалі зьбірацца групкі дапрызыўнікаў па ротах. Аддзялённыя камандзіры, сабраўшыя групкі, забіралі і разводзілі іх па кватэрах.

Каля цырульні поўна навабранцаў.

— Гэта першая частка санітарнай апрацоўкі, а далей—лазьня і выдача абмундыраваньня.

Увечары вясковых хлопцаў з клумкамі нельга было пазнаць: пад камандай камандзіраў навабранцы - чырвонаармейцы стройнымі калёнамі шнуравалі па вуліцах.

„Малайцы 1905 год, як стараслужачыя ідуць у нагу“—гаварылі кадравікі. Увечары адбылася пастаноўка і кіно.

Раніцой прышлі фурманкі для адвозу маёмасьці ў лягеры.

Рота за ротай чырвонаармейцы сходзяцца на плошчу, а праз некаторы час і ўсе грамадзкія арганізацыі і школы г. Чэрвеня праводзяць полк у лягеры.

Перад адходам адчыняецца мітынг. Прадстаўнікі ад грамадзкіх арганізацый у сваіх прамовах ускладалі на полк абавязак яшчэ больш узьняць баявую моц. Чырвонаармейцы адказалі на гэта гучным „ура“, як бы кажучы, што ўсе задачы з гонарам выканаюць.

Пад гукі маршу духавога аркестру зялёнай стужкаю полк рушыцца ў паход.

Настрой чырвонаармейцаў бадзёры. На прывалах—сьпевы скокі, жарты, праз 10 кілёмэтраў вялікі прывал і адпачынак. Агледзеўшы зброю, чырвонаармейцы пусьціліся ў скокі з дзяўчатамі, якія прышлі з бліжэйшых вёсак.

Зноў стройныя шэрагі рушылі ў паход. Праз некалькі гадзін на кругавідзе першае месца адпачынку—м-ка Сьмілавічы.

Грамадзкія арганізацыі ўрачыста спаткалі дарагіх гасьцей. Прывітаньні, гучнае „ура“—нясуцца ў нагрэтым паветры.

Полк разьмясьціўся па кватэрах для начоўкі.

Шэсьць гадзін раніцы—полк зноў рушыў у дарогу. Гарачыя праменьні сонца пачынаюць моцна прыпякаць. Палова дарогі—адпачынак маленькі і зноў уперад.

А вось хваёвы лес, а ў ім—палатняны гарадок.

Палаткі гатовы, месца для жыцьця ёсьць. Пятнаццатага мая лягер ажыў.

З сьвежымі сіламі, з бадзёрым настроем чырвонаармейцы ўпарта ўзяліся за вайскова-палітычную навуку.

М. Працька.

Маладая энэргія на варце краіны.

(Малюнак з натуры)

Вясна... Ціха гуляюць сонечныя праменьні па лясным абшары; хвоі пававаюць цёпла-паручым смалістым вецярком. Учора гэты бор быў смутны:—валяліся мінулагоднія лісьці-голкі, суччa што абламалася ад вялікіх вятроў у часе зімы.

Няпрывабна выглядалі гнёзды шатроў Ленштатры гаварылі аб тым, што тут даўно ўжо ня было гаспадарчай рукі.

Ганкі былі занесены сухімі іглiцамі хвой, паміж якіх выглядала пачарнелае

лісьце бярозы і клёну. І усё гэта здавалася як бы патрэбным.

— Але праз некалькі дзён у гэтай ляснай глушы зьявіўся новы горад... Белыя палотнішчы шатроў распусьцілі і свае крыльлі сярод прыгожых хвоек, і горда ўзьняліся чырвоныя сьцягі... Новы горад прынёс у гэту лясную глуш бадзёрасьць жыцьця і прагрэсу...

Маладая энэргія вартаўнікоў Савецкага Саюзу, якія ўчора зьявіліся з шэрай вёскі, фабрык і заводаў, сёньня бадзёрыць сваімі песьнямі; галасамі крыклівай вясковай гармонікі і скрыпкі хвалюе лес.

Два дні... А колькі тут новага ўсплыло! Чыстыя жоўтыя дарожкі пабеглі ў розныя бакі, палотнішчы шатроў, пляц фізкультуры—усё гэта выглядае надзвычайна прыгожа, песьціць вока...

Вечар. Ленштацёр № роты. Сход. На парадку дню—сацыялістычнае спаборніцтва.

Таварышы!—зьвяртаецца камандзір роты тав. Сапранёнак да чырвонаармейцаў. —Сёньня ў нас стаіць пытаньне сацыялістычнага спаборніцтва, якое мае сваёй мэтай узмацніць баяздольнасьць нашага палка. Дзеля гэтага мы павінны будзем выявіць самую напружаную энэргію ва ўсёй нашай вайсковай вучобе. Мы маем у роце 32 чалавекі няпісьменных, за гэты кароткі тэрмін павінны ліквідаваць іх няпісьменнасьць. Наша Чырвоная армія патрабуе клясава сьвядомага байца, каб ён ведаў, за што ідзе, ня так, як у буржуазных краінах, дзе ніводзін салдат ня ведае, за што ён будзе ваяваць. А таму, ставячы пытаньне сацыялістычнага спаборніцтва—больш энэргіі і зацікаўленнасьці ва ўсёй працы.—Выклікаючы № роту, мы думаем апраўдаць сябе ва ўсіх адносінах.

Прымаецца плян сацыялістычнага спаборніцтва: 75 проц. выкананьня па стральбе 85 проц.—з кулямётаў: 70 проц.—уступленьня ў МОПР, 75 проц. —у Асоавіяхім; узмацніць антырэлігійную працу, ніводнай самавольнай адлучкі; ліквідаваньне няпісьменнасьці на 100 проц.

З вясёлым настроем чырвонаармейцы выходзяць з ленштатра, вядуць паміж сабой гутаркі рыхтуючыся аддаць усе сілы і энэргію на найлепшую пастаноўку працы.

Ноч. Ціха. Толькі месяц, вышчарыўшы зубы, малюе белыя палотнішчы шатроў і нібы наглядае за гэтым прыгожым ціхім гарадком...

Раніца. Зноў усьпенілася маладая энэргія. Іншыя роты даведаўшыся, што № рота першая ўступіла ў сацыялістычнае спаборніцтва, праводзяць па сваіх ленштатрох сходы. Ніводнага супроць. Усе, як адзін, згадзіліся выступіць у сацыялістычнае спаборніцтва...

Маладая энэргія на варце краіны.

Янка Лашкевіч.

Прапрацоўваем пастановы XVI партканфэрэнцыі.

(№-скі Чырвонаштандартны полк).

Партарганізацыя палка прыступіла да прапрацоўкі пастаноў XVI партканфэрэнцыі. Па ўсіх ленкутках утвораны куткі наочнай агітацыі: дыяграмы, галоўныя пастановы па пытаньнях разьвіцьця прамысловасьці і сельскай гаспадаркі. Сярод навабранцаў-пераменьнікаў праведзены гутаркі аб чыстцы партыі і савецкага апарату. Таксама праведзены адкрытыя партсходы з пытаньнямі аб узьняцьці сельскай гаспадаркі і падатковае палегчаньне серадняка.

Для прапрацоўкі XVI партканфэрэнцыі ўтворана 5 груп, у якіх мае быць праведзена 6 заняткаў з удзелам беспартыйнага каманднага складу палка. Такія-ж групы ўтвораны ў камсамольскай арганізацыі.

Я. Ляшкевіч.

З ЛІСТОЎ ВАЙСКОЎЦАЎ.

ДАПАМАГАЕМ ПРАЛЕТАРЫЯМ НЯМЕЧЧЫНЫ.

Некалькі дзён таму назад, у сувязі з прыходам чырвонаармейцаў 1906 г. нараджэньня ў лягер, адбыўся агульны сход радавых чырвонаармейцаў разам з камскладам.

Сход заслухаў даклад тав. Бабкова аб зьверскіх распраўах буржуазеі з рабочымі Нямеччыны ў сьвята 1 мая.

Агульны сход аднагалосна ўхваліў наступную пастанову:

— Сярэдняму і старшаму камандна-палітычнаму складу адлічыць адзін процант месячнага заработку ў карысьць нямецкіх пралетарыяў, радавому складу і малодшаму камскладу — адлічыць па 10 кап. Сабраныя грошы на другі дзень пераведзены па тэлеграфу па прызначэньні.

Сувязіст.

ТРЭБА ЎПАРАДКАВАЦЬ СПРАВУ З ЛАРКОМ.

У лягеры зьявілася каля 3000 чалавек чырвонаармейцаў, пераважная большасьць пайшчыкаў, якія маюць патрэбу ў некаторых прадуктах. Праўда, ёсьць ларок ЦРК, але таго, што патрэбна чырвонаармейцам, у ларку няма. Аршанскае праўленьне ЦРК не зварачвае ўвагі на пашырэньне ларка пры лягэры і на дастаўку неабходных тавараў. Напрыклад, калача чырвонаармеец ніколі ня можа купіць, французкіх булак бывае на 100 чал. адзін дзесятак і г. д.

Апроч гэтых недахопаў, прыказчык ларка Левін груба абыходзіцца з чырвонаармейцамі, і патрэбныя прадукты адпускае толькі знаёмым.

Чырвонаармеец Ст. Іва.

ЛІТАРАТУРУ ДЛЯ ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ.

(г. Ворша).

Чырвонаармейцы-беларусы № дывізіі, якія знаходзяцца па-за межамі Беларусі, прыслалі акрвыканкому ліст, і якім пішуць, што яны ня ведаюць аб сучасным становішчы іх роднай краіны Беларусі, але цікавяцца ўсім тым, што робіцца ў Беларусі, і просяць выпісаць для іх беларускія газэты і бібліатэчку.

Акрвыканком запрапанаваў Інспэктару Асьветы набыць бібліатэчку аб культурным і гаспадарчым становішчы Беларусі і паслаць яе чырвонаармейцам. Таксама вынесена пастанова аб выпісцы для чырвонаармейцаў беларускіх газэт і аб адказе чырвонаармейцам лістом ад імя акрвыканкому.

А. Мілашэўскі.

Школа—на новыя рэйкі.

ВЫКЛІКАЕМ НА САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА.

Студэнцтва Мазырскага пэдтэхнікуму пастанавіла скарыстаць летні перапынак у занятках для максымальна-напружанай грамадзкай працы сярод насельніцтва на карысьць вялікага сацыялістычнага будаўніцтва.

Усе сілы, увесь малады энтузіязм на дапамогу пралетарскім элемэнтам гораду і вёскі, на змаганьне з клясавым ворагам і някультурнасьцю.

Выклікаем на сацыялістычнае спаборніцтва ў гэтай працы студэнцтва Гомельскага пэдтэхнікуму.

Нашы умовы: 1. Стопроцантнае ўцягненьне студэнцтва ў грамадзкую працу. 2. Максымальная плянавасьць і арганізаванасьць у працы, узгодненасьць з масцовымі ўстановамі і арганізацыямі, канкрэтнасьць, як у пляне, так і ў выніках. 3. Найбольшае выяўленьне і прыцягненьне да актыўнай грамадзкай працы ўсёй жывой сілы вёскі: дэмабілізаваных чырвонаармейцаў, студэнтаў-адпускнікоў, рабочых, батракоў і г. д. 4. Найвышэйшы проц. ліквідаванай няпісьменнасьці і малапісьменнасьці, у першую чаргу ў камунах, калгасах і саўгасах і сярод беднаты. 5. Максымальнае практычнае ажыцьцяўленьне лёзунгаў калектывізацыі сельскай гаспадаркі, вытворчага кантраваньня беднейшага сялянства, машынізацыі гаспадаркі, кантрактацыі, аграпрапаганды ва ўсіх відах, практычнай дапамогі ў арганізацыі і працы паказальных і прышкольных зямельных вучасткаў. 6. Найбольш пасьпяховая барацьба з „засарэньнем“ савецкага апарату і навучальных устаноў клясава-чужым элемэнтам. Садзейнічаньне чыстцы апарату і выяўленьню варожага элемэнту ў навучальных установах. 7. Максымальнае выяўленьне новых кадраў як у савецкі апарат, так і ў навучальныя ўстановы з рабочых, бядняцкай і батрацкай моладзі. Найбольшы процант выяўленых і накіраваных у школы с-моладзі, на рабфакі, у тэхнікумы, вузы, вайсковыя школы. 8. Максымальнае прасоўваньне ў шырокія рабочыя і бядняцкія масы кніг, газэт, часопісаў, радыё. 9. Найбольш рашучае і ўмелае змаганьне з рэлігійнымі забабонамі ва ўсіх відах. 10. Своечасовая і рашучая барацьба з дробна-буржуазнымі і кулацкімі настроямі, лёзунгамі, выступленьнямі, групоўкамі. 11. Змаганьне з цяжкай спадчынай царызму—антысэмітызмам, нацыянал-шавінізмам, імкненьнем падмяніць клясавую барацьбу нацыянальнай. 12. Максымальнае падняцьце масавай культасьветнай працы, асабліва ў камунах, саўгасах, калгасах, арганізацыя хат-чытален, чырвоных кутноў, насьценгазэт і г. д. 13. Арганізацыя гуртноў па с-гаспадарцы, ваенізацыі, рабкораўскіх, дабраахвотных таварыстваў. 14. Максымальнае ўцягненьне насельніцтва ў працу па палепшаньню дабрабыту (рамонт мастоў, пажарная справа, арганізацыя дзіцячых пляцовак, ясьляў і г. д.).

Ацэнка ўсёй працы як індывідуальнай, так і па ўсяму тэхнікуму павінна рабіцца па канкрэтных, практычна дасягнутых выніках.

ПЭДРАДА І АГУЛЬНЫ СХОД СТУДЭНТАЎ МАЗЫРСКАГА ТЭХНІКУМУ.

Вайна другагодніцтву, цемры і папоўскай хлусьні.

ШКОЛЫ ВЫХОДЗЯЦЬ НА САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА.

Школьная рада III Слуцкай 7-годкі пастанавіла выклікаць III Бабруйскую 7-годку на сацыялістычнае спаборніцтва па наступных пунктах работы: 1) зьменшыць другагодніцтва на 5 проц.; 2) зьнішчыць прагулы і спазьненьні вучняў; 3) арганізаваць пры школе лікпункт на 40 чалавек, абслугоўваць яго сіламі школы; 4) у кожнай групе стварыць куток бязбожніка; 6) па II канцэнтру на ўсе 100 проц. уцягнуць вучняў у члены ячэйкі бязбожнікаў, па I канц. арганізаваць гурток юных прыхільнікаў бязбожніка і ўцягнуць па I і II гр. 50 проц., па III і IV гр. 75 проц., узмацніць антырэлігійнае выхаваньне: 6) школе стала падрыхтавацца да навучальнага 1929-30 году; 7) з будучага навучальнага году настаўнікам прымаць шырокі ўдзел у працы падшэфнай вясковай школы, праводзіць працу плянава, дастаўляючы вёсцы газэты і кнігі; 8) пашырыць выпіску газэт—1 газэта на 5 вучняў: 9) праводзіць працу сярод бацькоў, схіляючы бацькаўскія сходы праз кожныя два месяцы.

Тэрмін выкананьня гэтых пунктаў да 15 чэрвеня 30 году.

Б. ЗЯНЬКОВІЧ.

НОВАЯ АХВЯРА МАСЛАКОЎШЧЫНЫ.

Трэба зараз-жа выявіць—чыімі клопатамі Круглянская сямігодка трапіла ў рукі Маслакова.

У газэце „Савецкая Беларусь“ ад 9-V г. г. за № 102 быў надрукован артыкул „Мілаславіцкая склока“, у якім апісваюцца брудныя бясчынствы заг. Мілаславіцкай 7-мігодкі (Магілеўскай акр.) гр-на Маслакова. Паведамлялася, што за шэраг злачынстваў ён быў зьнят з працы і аддадзен пад суд.

Зараз невядома, якім чынам гэты гэрой Маслакоў апынуўся загадчыкам Круглянскай 7-мігадовай школы (Аршанскай акр.). Не прайшло і аднаго м-ца, як гр. Маслакоў стаў выяўляць свае здольнасьці па разлажэньню здаровага настаўніцкага і вучнёўскага калектыву і ў Круглянскай сямігодцы. Вось факты дзейнасьці Маслакова на новым месцы:

Бяз усякіх прычын ён зьняў з працы дзелавода школы т. Гусьціна—камсамольца-батрака, а дзелаводзтва школы даручыў настаўніцы Раханскай, з якой, як чуваць, Маслакоў увайшоў у часовае сажыцельства. Сажыцельства Маслакоў прапанаваў і іншым настаўніцам, але яны адмовіліся. Зараз на гэтай «інтымнай» глебе сярод настаўніц узьнікла рэўнасьць, склокі, некаторыя паміж сабой часам нават не гавораць.

Загадчык Маслакоў працай школы ня кіруе, на занятках бывае адзін раз у тыдзень. Школьная і пэдагагічная рады не працуюць. Дысцыпліна сярод настаўнікаў і вучняў пала, якасьць выхаваньня ў школе зьнізілася. Сярод вучняў стала ўкараняцца хуліганства, пачынае ўзрастаць антысэмітызм. Ні загадчык Маслакоў, ні настаўніцтва на гэтыя хваробныя зьявішчы ў належнай ступені не рэагуюць.

Школа рыхтавалася да антывялікоднай кампаніі. Рыхтавалі пастаноўку дакладаў, спэктакляў і інш. у падшэфных вёсках Шупенях і Ліхінічах. У Шупенях вечар быў сарван па прычыне таго, што сваю каханую настаўніцу Раханскую Маслакоў ня пусьціў пайсьці праводзіць антырэлігійны вечар, а астатнія настаўнікі на грунце гэтага ісьці адмовіліся. Такім чынам вечары ў 2-х вёсках Маслакоў сарваў.

Маслакоў часьценька і выпіць любіць і нават 1 і 2-га мая хадзіў па вуліцы п'яны.

Усё гэта робіцца на вачох райінспэктара Слабодзіча і раённых арганізацый, але ніхто і ў вус ня дуе.

Маслакоў—поўнасьцю разбэшчаны элемэнт, п'яніца, нядбайна адносіцца да працы. Ён разбурвае нашы школы і дыскрэдытуе іх у вачох насельніцтва. Не павінна быць месца такім тыпам у працоўнай савецкай школе. Пралетарская мятла павінна вычысьціць Маслакова з настаўніцкіх шэрагаў раз і назаўсёды.

А.

м. Круглае.

З вёскі ў горад.

8 мая а 5 гадзіне раніцы група вучняў Баршчоўскай школы (на Гомельшчыне) у складзе 17 чалавек накіравалася ў экскурсію ў горад Гомель.

У Гомелі нас сустрэла настаўніца, якая паехала напярэдадні, каб умовіцца наконт пропуску ў тыя прадпрыемствы, якія ўваходзілі ў наш плян.

Крыху адпачыўшы, мы накіраваліся ў парк імя Луначарскага, дзе зьмяшчаецца гістарычны музэй, зімовы сад і маленькі зьвярынец. Заўсёды зялёная паўднёвая расьліннасьць, асабліва пальмы ў садзе, мядзьведзь, ваўкі і ліс у зьвярынцы—усё гэта вельмі зацікавіла дзяцей.

Музэй, дзе ў першую чаргу нам паказалі аддзел рэвалюцыі з малюнкамі гістарычнай барацьбы рабочай клясы і сялянства наогул і ў межах Гомельшчыны ў прыватнасьці, матэр'ялы з часоў грамадзянскай вайны замацавалі ў дзяцей уяўленьне ўсяго таго, што яны чулі пры распрацоўках адпаведных комплексных тэм у школе.

Багацьце былога гаспадара палацу кн. Паскевіча, якое потым аглядалі дзеці, выклікала мімавольнае зьдзіўленьне: „няўжо-ж адна сям'я была ўласьнікам і гэтых пакояў і гэтай маёмасьці“?

Прыродазнаўчы аддзел, дзе выстаўлены косьці маманта і іншыя экспанаты мінулага, прыцягвалі да сябе вялікую ўвагу вучняў.

Абыходам палацу знадворку мы скончылі агляд музэю і накіраваліся ў швэйную фабрыку „Інтэрнацыянал“, дзе шырока выкарыстоўваецца электрычнасьць, як рухавік сотні машын і як награваючая сіла. Строга вызначаныя галіны працы рабочых і работніц і хуткасьць вырабу вопраткі розных відаў і бялізны, наогул масавая вытворчасьць, што дзеці бачылі ўпяршыню, ашаламіла іх. Лагоднымі ўлыбкамі праважалі нечаканых гасьцей рабочыя.

А другой гадзіне з паўдня, згодна пляну экскурсіі, нам трэба было паехаць у Нова-Беліцу аглядаць сярніковую фабрыку „Везуві“. З прычыны паводкі, пантонны мост разьведзен, і зносіны з Нова-Беліцай падтрымліваюцца на маторных лодках, а далей аўтабусамі і фурманкамі.

Тое, што ўбачылі дзеці на „Везувіі“, яшчэ больш зьдзівіла іх. Кожны аддзел з яго складанымі машынамі і да неpraўдападобнасьці хітрымі прыладамі на вясковае дзіцяцё ўплывала як дзіўная казка. Дзіўным паказалася і рабочым поплеч з дасканалымі вынаходкамі тэхнікі бачыць нашых вясковых дзяцей, зачараваных, захапленых. Наш павадыр, камсамолец з ліку рабочых, пры разьвітаньні выказаў жаль, што мала хто бярэ на сябе задачу знаёміць вясковых вучняў з прадпрыемствамі гораду, у прыватнасьці з іхнай фабрыкай. Экскурсія з вёсак для іх—зьява выключная.

Вярнуўшыся ў Гомель і папалуднаваўшы, накіраваліся на адведзіны да новага шэфа (№-га кавалерыйскага палка), які прыслаў ужо ў нашу вёску сваіх прадстаўнікоў на правядзеньне антывялікоднай кампаніі. Сустрэлі нас вельмі прыветна, паказалі казарму, канюшні. Спальныя і сталовыя пакоі чырвонаармейцаў, бібліатэка, клюб, кляса для заняткаў, наогул усе памяшканьні сваёй чыстатой і парадкам зьдзівілі дзяцей. Яны пажадалі бачыць усё, што зьвязана з жыцьцём у казарме, таму дзяжурны па палку паказаў нават, як чырвонаармейцы чысьцяць сабе на прыварак бульбу, гатовяць на катлеты мяса, рэжуць хлеб, мятуць падлогу і інш.

Мы трапілі якраз у час чысткі коняй, таму мелі магчымасьць бачыць, як чырвоныя байцы берагуць сваю жывёлу. Чыстата ў канюшнях, добры выгляд коняй, бадзёрасьць чырвонаармейцаў і таварыская адносіны да іх начальства і ўсе ўмовы вайсковай службы—усё гэта захапіла дзетвару. Асабліва радавалася Ганулька, у якой брат служыць у Чырвонай арміі.

На другі дзень маршрут намячаў радовых прадпрыемстваў і музэяў. А 9-й гадзіне раніцы мы былі ўжо каля будынку „Палесьпечаці“. Зноў зьдзіўленьне і радасьць засьвяціліся ў вачох дзяцей. Працэс друку, зручнасьць наборшчыкаў, спосаб друкаваньня газэт і кніжак, малюнкаў і здымкаў--усё гэта зацікавіла дзяцей.

Да абеду справіліся пабываць яшчэ ў пэдагагічным музэі з яго калекцыямі, з сьпіртаванымі прэпаратамі, чучаламі зьвяроў і аддзяленьнямі біостанцыі юных натуралістых. Белыя пацукі, вужы, чарапахі, трусы, марскія сьвінкі і ўсё што ёсьць у гэтых аддзяленьнях—найбольш прыцягнула ўвагу дзяцей.

Заставалася пабачыць кіно-карціну, на гэтым і канчаўся наш маршрут.

Дамоў ехалі з вялікім запасам уражаньняў. Ня гледзячы на позны час, дзеці адчувалі сябе бадзёра, жартавалі ў вагоне.

Мікола Альбіцкі.

У зімовым садзе (парк імя Луначарскага).

ПАДАГУЛІЛІ ПРАЦУ ШКОЛЫ ЗА ГОД.

(Гарэліцкая школа, Пухавіцкі р., Менскай акр.).

Да гэтага году ў вясковых школах пераводы з групы ў групу рабіў сам настаўнік. У гэтым-жа годзе пераводы рабіліся пры ўдзеле школьнай рады, партыйных і грамадзкіх арганізацый.

Новы парадак пераводаў ужо даў вынікі. Школьныя рады, якія прымаюць ужо непасрэдны ўдзел у працы школы і ў падагульненьні гэтае працы, прыцягнуць увагу грамадзянства да школы.

Дзеці на падагульваючых занятках у прысутнасьці школьнай рады і іншых грамадзян адчуваюць сябе добра, не палохаюцца і вельмі здаволены. Ня трэба толькі дапускаць перагібу ў падыходзе да непасьпяваючых вучняў.

Наогул можна з упэўненасьцю сказаць, што ўдзел школьнай рады і бацькоў вучняў у падагуленьні школьнай працы за год значна павысіць пасьпяховасьць усіх вучняў, дапаможа сваім уплывам зьнішчыць ненармальныя зьявішчы ў жыцьці школы. З другога боку ўзмацніцца культурны ўплыў школы на акаляючае насельніцтва.

Н.

У ПАДШЭФНУЮ ВЁСКУ.

Цёплы маёвы дзень... Санейка ласкава сваімі праменьнямі заглядае ў вочы вясёлай бадзёрай вучнёўскай моладзі, якая сьпяшаецца па Койданаўскім гасьцінцы ў падшэфную вёску і саўгас Сеньніцу прывітаць працоўных з вялікім сьвятам—веснавой сяўбой і ўнесьці сваю крупіцу ўдзелу ў справу падняцьця ўраджайнасьці

Доўга рыхтавалася практычна-паказальная школа пры Белпэдтэхнікуме. Сабралі невялікія сродкі, купілі плуг, падрыхтавалі рэвалюцыйную п'есу ў 3-х дзеях, струнны аркестр, і ў ліку 30 чал. вучняў і 2-х настаўнікаў накіраваліся ў Сеньніцу. Вольнае сьвежае паветра палёў падмацоўвала сілы і надавала бадзёрасьці і ўпэўненасьці ў добрай справе.

Праз 2 з паловай гадзіны вучні адпачывалі і частаваліся сьвежым малаком саўгасу. Схавалася сонейка... 9-я гадзіна вечару... Затарацеў трактар уяжджаючы на двор застукалі дзьверы ў аборах і стайнях... Скончыўся працоўны дзень саўгасу. Абвешчаныя аб прыезьдзе шэфаў вяскоўцы і саўгасаўцы ня гледзячы на зморанасьць, напоўнілі клюб. У цёплай братэрскай гутарцы настаўнікі і вучні высьвятляюць мэту прыезду, заклікаюць да калектыўнай згуртаванасьці ў працы—як галоўнай умовы на шляху да новых перамог ў справе індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі. З напружанай увагай слухаюць гутарку, глядзяць п'есу узьнімаюць настрой народныя і рэвалюцыйныя сьпевы і струнны аркест. Падшэфныя запрашаюць гасьцей наведваць іх...

Вучні вярнуліся ў горад бадзёрыя і вясёлыя здаволеныя посьпехам.

Экскурсант.

„ЧЫРВОНАЕ УРОЧЫШЧА“.

Замест „архіярэйскай пусташы“.

Архіярэйскага дому няма. Удзячная «паства» зьнішчыла гэты помнік цемры і ганьбы.

Пляц, дзе былі пакоі, абкружае жывая агароджа. Сярод кустоў і кветак вырас кіёск Белдзяржвыдавецтва... Новы творца і пановаму творыць жыцьцё:

„Да будзе сьвет!“

І замест тоўстай тушы «вялікага пустэльніка», «страстацерпца пярын», «айца» і „жаніха сонму міраносіц“, ня ў спальным пакоі, а ў новенькім кіёску лягуць тоўстыя і тонкія беларускія кнігі...

„І стаў сьвет!“

Пад жывой агароджай кустоў і кветак прыемна прачытаць новае слова новых людзей. Пад гарою—рэчка сьмяецца сонечным сьмехам, а за рэчкай рунеюць далі і ў парчовай вуалі, сатканай з сонца і паветра.

У архіярэя „губа была ня дура“.

Прыемна і прайсьціся па сасновай алеі. Яна вядзе і ў сасновы лес і ў царкву.

„Ну і памучыліся, пакуль крыж зьнялі!“—кажа мой праваднік, зямляк, доктар.

У царкве—прыймовы пакой палка. Пакой абслугоўвае ўвесь лягер... А вакол—сасоньнік, равы, прыгожыя стромы, і паветра чыстае, як пацалунак дзіцяці.

Ня „пусташ“, а рай.

Дыхаеш вольна; радасьцю напаўняецца сэрца: „першых“ людзей выгналі з раю... І шкадаваць няма каму. Ці няе тут дзе-небудзь хоць адна з былых „міраносіц“, „услаждавшых“ сьвятое ложа пустэльніка, сумную песьню.

— «Дзе вы цяпер, хто вам цалуе пальцы»...

На лесе бухае рэха вучэбнай стральбы. Не да сумных думак. Чырвоная сучаснасьць новым настроем хвалюе ўсю істоту...

„Лягер—горад палатняны“.

Сонца абліло гэты палатняны горад алюмініем і «пазалотаю румянай». Горад кіпіць жыцьцём. Прыгожыя, новенькія хаткі аздоблены плякатамі і партрэтамі правадыроў. Чуецца каманда:

— Дзяжурны на лінію!

Начпадыў сьпяе каманду:

— Адставіць, дзяжурны на лінію!

Новыя хаткі-ленкуткі, а ў іх ідзе ленінская вучоба.

— Зважай!

Сустракае нас каманда кіраўніка палітгуртка, і рапарт:

—... Гурток працуе над рашэньнямі XVI партканфэрэнцыі...

На сьценах—апошні бой Чапаева, паўстаньне на „Потемкине“, дыяграмы, схэмы, лічбы, пяцігодкі...

Гартуецца баец і будаўнік.

На вэрандзе ленкутка свой мастак малюе „намётку“ пяцёхгадовага пляну. Просты чырвонаармеец замілавана глядзіць на справу сваіх рук.

— Гэта член беларускага ўраду, член ЦВК БССР тав. Буглак,—тлумачыць мне начпадыў.

Член ураду робіць маленькую справу, як і тысячы людзей, апранутых у хакі, як міліёны новых людзей на шостай частцы зямной кулі. А з маленькіх складаемых вырастае вялікая сума, якая дзівіць сваёй магутнасьцю, ласкоча нэрвы начуцьцём пагарды:

— Гэта-ж нашы, гэта мы, гэта тыя, хто парваў путы рабства, хто творыць новае жыцьцё.

А вось лікпункт.

— Чаму мы павінны зьнішчыць няпісьменнасьць?—пытаецца начпадыў у таварыша, перад якім ляжыць лемантар і сшытак з няроўнымі літарамі.

— Гэта-ж самае галоўнае. Няпісьменны—цёмны чалавек. Ён глядзіць у кнігу, як на дошку пустую.

Чырвонае Урочышча—сёньня гэта палатняны горад цудаў.

Пяцігадовы плян будзе выкананы.

Гэта ўпэўненасьць расьце на кожным кроку.

Сход начпалітскладу слухае даклад аб выніках XVI усесаюзнай партканфэрэнцыі. Той энтузіязм, які павінен зьявіцца залогам пасьпяховага выкананьня пяцігодкі, жыве і тут.

...«Выхад на сацыялістычнае спаборніцтва вайсковых часьцей, гурткоў, асобных адзінак—гэта мэтад працы і вучобы і тут, у Чырвонай арміі».

І ў рэзалюцыю ўносіцца:

„Сход лічыць неабходным поўнасьцю выкарыстаць ленінскі мэтад сацыялістычнага спаборніцтва і павесьці рашучую барацьбу з бюракратызмам па ўсіх лініях“.

Чырвоныя камандзіры і палітработнікі за адзінства партыі, за генэральную лінію партыі:

„Сход вітае тое ленінскае адзінства, з якім партыя падышла да вырашэньня задач далейшага сацыялістычнага будаўніцтва»...

І ня толькі аб выхаваньні сваіх шэрагаў клапоціцца начальніцкі склад:

„Неабходна дамагацца, каб сувязь чырвонаармейца з вёскай была поўнасьцю выкарыстана для растлумачэньня задач пяцігадовага пляну сярод бядняцка-серадняцкага сялянства“...

Упэўненасьць у тым, што плян будзе выкананы, адчуваецца на кожным кроку лягернага жыцьця і вучобы—і ў раскатах стрэлаў па лесе, і ў ланцужках байцоў, што перабягаюць па шырокаму зялёнаму лугу, і ля навадных станкоў, і нават у сьмелай і бадзёрай поступі музыкаў, якія перарэзваюць пляц паміж палаткамі і штабам... Музыкі ідуць стройнымі шэрагамі з вялічэзнымі трубамі за плячыма і сьпяваюць песьні пра сваю баявую гатоўнасьць. І адчуваецца, што і яны гатовы ў патрэбны час загрымець у трубы так, як ніхто ніколі ня грымеў, загрымець баявым заклікам, загудзець набатам... Зараз трубы маўчаць, і ў гэтым маўчаньні адчуваецца нейкая ўрачыстасьць і ўпэўненасьць у сваёй моцы.

Пакрытыя славай.

Цішынёй і ўрачыстасьцю абвеяна месца, дзе захаваны штандары, маленькая «беседка»—навес... Самае сьвятое месца ў лягеры. Сюды не падыдзеш без дазволу.

Баявыя штандары—сьведкі слаўных дзён мінулых перамог— абуджваюць успаміны: дні Перакопа і Варшавы, гэроіка грамадзянскай вайны на шматлікіх фронтах, слаўныя баі за новае жыцьцё новага чалавека...

... Гутарка з камандзірам артпалка, тав. В., па дарозе ў горад яшчэ больш дадала ўпэўненасьці ў тым, што Чырвоная армія выканае пяцігодку нават і ў тым выпадку, калі ў плян хто-небудзь унясе новыя звышплянавыя заданьні...

Вадзім Бязьмежны.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ УРАДУ БССР

Пастанова

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра зьмену і дапаўненьне Крымінальнага Кодэксу БССР.

На падставе пастаноў Цэнтральнага Выканаўчаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў Саюзу ССР: „Пра зацьверджаньне мытнага Кодэксу Саюзу ССР“ (З. З. СССР—1929 г. № 1, арт. 1). „Пра зьмену і дапаўненьне палажэньня аб вайсковых трыбуналах і вайсковай пракуратуры“ (З. З, СССР — 1929 г. № 13, арт. 106) і „Пра мерапрыёмствы для ўзмацненьня барацьбы з транспартнымі злачынствамі“ (З. З. СССР — 1929 г. № 21, арт. 182), Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць дапоўніць і зьмяніць Крымінальны Кодэкс БССР так:

1. Дапоўніць Крымінальны Кодэкс артыкуламі 80^2, 108^1, 108^2 і 230^1 у наступнай рэдакцыі:

„80^2. Разбурэньне альбо псаваньне чыгунак і іншых шляхоў, пабудоў на іх, перасьцярожных знакаў, рухавага складу і суднаў, каб зрабіць крушэньне цягніка альбо судна выклікае—пазбаўленьне волі са строгаю ізаляцыяю ня менш як на тры гады, з канфіскацыяй усяе альбо часткі маемасьці, з падвышэньнем пры асабліва абцяжваючых акалічнасьцях аж да вышэйшай меры сацыяльнай абароны —расстрэлу, з канфіскацыяй маемасьці“,

„108^1. Парушэньне ўстаноўленых абавязковымі пастановамі Народнага Камісарыяту Шляхоў і яго органам правіл аб ахове парадку і бясьпекі руху, ахове маемасьці транспарту, недапушчэньні і спыненьні незаконнага скарыстаньня транспарту, а таксама аб ажыцьцяўленьні санітарных і супроцьпажарных мерапрыёмстваў, калі парушэньне мела цяжкія вынікі, выклікае—пазбаўленьне волі да трох гадоў альбо штраф да трох тысяч рублёў“.

„108^2. Парушэньне па-за партавымі водамі ўстаноўленых законам, альбо загадам належных органаў правіл аб недапушчэньні сутычак суднаў на моры, аб захадах аховы падводных тэлеграфных кабеляў і іншых правіл, якія рэгулююць марское судаходзтва, калі парушэньне не зьяўляецца для асобы, што зрабіла яго, службовым злачынствам, выклікае—штраф да трохсот рублёў, а калі парушэньне мела цяжкія вынікі—пазбаўленьне волі да трох гадоў альбо штраф да трох тысяч руб.

„230^1. Непаданьне капітанам судна асобам, што гінуць на моры альбо на іншым водным шляху, дапамогі, якую можна было падаць бяз сур'ёзнай нябясьпекі для судна, экіпажу і пасажыраў, выклікае—пазбаўленьне волі да двох гадоў“.

2. Увагу да артыкулу 87 Крымінальнага Кодэксу скасаваць.

3. Другі абзац арт. 164 Крымінальнага Кодэксу запісаць так:

„Вайсковымі злачынствамі лічацца таксама злачынствы супроць устаноўленага парадку службы, учыненыя асобамі ваенізаванага складу аховы шляхоў Народнага Камісарыяту Шляхоў і ваенізаванай аховы прадпрыёмстваў і пабудоў, якія маюць асаблівае дзяржаўнае значэньне“.

4. Дадаткам 4 да Крымінальнага Кодэксу, замест арт. арт. 259, 260. 261, 262, 263 і 279 Мытнага Статуту і выняткаў з пастановы Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саюзу ССР за 12 сьнежня 1924 г. „Пра ўвядзеньне ў дзеяньне Мытнага Статуту Саюзу ССР“, запісаць арт. арт. 164, 165, 166 і 178 Мытнага Кодэксу Саюзу ССР“.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Хацкевіч.**

18 мая 1929 г.
г. Менск.

Пастанова

Эканамічнае Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР

аб забясьпечаньні будаўніцтва тэхнічнымі кадрамі.

У мэтах забясьпечаньня будаўніцтва тэхнічнымі кадрамі і ўзмацненьня падрыхтоўкі тэхнічнага пэрсаналу—Эканамічная Нарада пры СНК БССР **пастанаўляе:**

1. Для забясьпечаньня будаўніцтва сярэдня-тэхнічным пэрсаналам лічыць мэтазгодным цалкам скарыстаць у гэтым годзе надыходзячы выпуск тэхнікаў у Менскім Палітэхнікуме, для чаго прапанаваць будаўнічым і будуючым арганізацыям загадзя замацаваць за сабою адпаведную колькасьць тэхнікаў і, акрамя таго, прыняць меры да скарыстаньня студэнтаў-практыкантаў з вышэйшых тэхнічных навучальных устаноў.

2. Недастатковую колькасьць дзесятнікаў папоўніць з ліку студэнтаў-практыкантаў Менскага Палітэхнікуму і курсантаў менскіх прафкурсаў, дзеля чаго абавязаць будаўнічыя і будуючыя арганізацыі сваечасова замацаваць за сабою патрэбную колькасьць іх у якасьці дзесятнікаў.

3. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Асьветы: а) павялічыць прыём студэнтаў у Менскі Палітэхнікум на наступны 1929-30 навучальны год і б) паскорыць распрацоўку пляну арганізацыі сеці школ дзесятнікаў для будаўнічых работ і выдатак на гэтыя школы ўключыць у бюджэт 1929-30 году.

4. Даручыць Народнаму Камісарыяту Асьветы сумесна з Народным Камісарыятам Працы ўзмацніць агульнае кіраваньне і кантроль па справе кваліфікаванай рабочай сілы для будаўніцтва (у школах дзесятнікаў, вучнёўства на будаўнічых працах і г. д.).

5. Абавязаць будаўнічыя арганізацыі сваечасова прадстаўляць свае заяўкі на студэнтаў-практыкантаў і ўжываць сыстэму кантрактацыі студэнтаў вышэйшых курсаў вышэйшых тэхнічных устаноў.

6. Прапанаваць будаўнічым арганізацыям больш запрашаць патрэбных ім інжынэраў з іншых савецкіх рэспублік, асабліва спэцыялістаў па ацяпленьні і вэнтыляцыі.

Старшыня Эканамічнае Нарады пры СНК БССР **М. Карклін.**

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР **В. Крывіцкі.**

6 мая 1929 г.
г. Менск.

Постановление

Экономического Совещания при Совете Народных Комиссаров БССР

об обеспечении строительства техническими кадрами.

В целях обеспечения строительства техническими кадрами и усиления подготовки технического персонала—Экономическое Совещание при Совете Народных Комиссаров БССР **постановляет:**

1. Для обеспечения строительства средне-техническим персоналом считать целесообразным целиком использовать в текущем году предстоящий выпуск техников в Минском Политехникуме, для чего предложить строительным и строющим организациям заблаговременно закрепить за собой соответствующее количество техников и, кроме того, принять меры к использованию студентов-практикантов из высших технических учебных заведений.

2. Недостающее количество десятников пополнить из числа студентов-практикантов Минского Политехникума и курсантов Минских Профкурсов, для чего обязать строительные и строющие организации своевременно закрепить за собой необходимое количество их в качестве десятников.

3. Предложить Народному Комиссариату Просвещения: а) увеличить прием студентов в Минский Политехникум в наступающий 1929-30 учебный год и б) ускорить разработку плана организации сети школ десятников для строительных работ и расход на эти школы включить в бюджэт 1929-30 года.

4. Поручить Народному Комиссариату Просвещения вместе с Народным Комиссариатом Труда усилить общее руководство и контроль над подготовкой квалифицированной рабочей силы для строительства (в школах десятников, ученичества на строительных работах и т. д.).

5. Обязать строительные организации своевременно представлять свои заявки на студентов-практикантов и применять систему контрактации студентов высших курсов высших технических учебных заведений.

6. Предложить строительным организациям усилить приглашение из других советских республик нужных им инженеров, особенно специалистов по отеплению и вентиляции.

Председатель Экономического Совещания при СНК БССР **М. Карклин.**

Зам. Управляющего Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР **В. Кривицкий.**

6 мая 1929 г.
г. Минск.

„Сав. Беларусь“ дапамагла.

ЗА ЗЬДЗЕКВАНЬНЕ ЗЬНЯТЫ З ПРАЦЫ І АДДАНЫ ПАД СУД.

У допісе „Усё добра, усё гладка“—паведамлялася, што ў Азарыцкай сямігодцы ёсьць шэраг ненармальных зьявішч у працы; таксама з боку настаўнікаў Ягорава і Лучкова былі выпадкі зьдзекваньня над вучнямі.

Рассьледваньнем факты пацьвердзіліся. Загадчыку сямёхгодкі Саванёвічу за тое, што ён ня прымаў мер да зьнішчэньня ненармальнасьцяй, абвешчан суровы выгавар з папярэджаньнем. Настаўнік Ягораў і Лучкоў за зьдзекваньне над вучнямі зьняты з працы, і справа аб іх перададзена пракурору для прыцягненьня да судовай адказнасьці. Разам з гэтым пастаўлена пытаньне аб аднаўленьні ўсяго складу настаўнікаў сямёхгодкі з новага навучальнага году.

ХУЛІГАНЫ СЬВІСТУН Р. І АХРЭМЧЫК УЛ. АДДАНЫ ПАД СУД

Па заметках—„Акрпракурор зьвярні ўвагу“—і—„Дакуль будуць зьдзекавацца хуліганы“,—зьмешчаных у „Савецкай Беларусі“ за 13 і 17 красавіка г.-г. пасьля рассьледваньня акрпракуратуры Менскай акругі паведамляе, што віноўнасьць гр. Сьвістуна Рыгора і Ахрэмчыка Ўладз. пацьвердзілася. Справа аб іх перадана ў Нарсуд Пухавіцкага раёну.

КАМПАНІЯ ХУЛІГАНАЎ БУДЗЕ РАЗАГНАНА.

У допісе—„Лясьнікі ў ролі бандытаў“—зьмешчаны у № 4 паходнай газэты, паведамлялася, што лясьнік Зеляновіцкага лясьніцтва Булаўка і кампанія п'янствуюць і хуліганяць. Факты наконт Булаўкі адпавядаюць сапраўднасьці. Булаўка зьнят з працы. Адносна астатніх справа перададзена сьледчым органам.

ШКЛЯРЫК АДДАНЫ ПАД СУД

У допісе—„Неабходна адрэмантаваць нэрвы“—зьмешчаным у № 64, паведамлялася аб грубых і бюракратычных адносінах загадчыка земчасткі Пухавіцкага РВК—Шклярыка.

На допіс нам. пракурора 3-га вуч. Менскай акругі, паведаміў, што факты пацьвердзіліся, і Шклярык, які ў апошні час быў загадчыкам грашовай часткі РВК і там таксама працаваў кепска, зараз зьнят з працы і адданы пад суд.

ШЭВЕРАЎ З ПРАЦЫ ЗЬНЯТЫ.

У „Савецкай Беларусі“ за студзень г.г. быў зьмешчан фэльетон Цім. Зарэчнага —„Руйнаваць, дык да канца“—аб старшыні Аршанскага спаж. таварыства Шэвераве, які выдаў незаконную кампэнсацыю Скапцу і інш. Пастановай РСІ Шэвераў, старшыня таварыства „Чырвоны Араты“, з працы зьняты.

Удар па зьберажэньнях.

У пачатку красавіка месяца г. г. у мясцовых газэтах было надрукавана паведамленьне Эльводу наступнага зьместу:

„Падаецца да ведама абанентаў электрычнасьці і вады, што з 1-га красавіка г. г. плата за электрычнасьць і ваду будзе зьбірацца інкасатарамі Белкамунбанку дома. Пры гэтым Эльвод папераджае, што калі інкасатару ў момант яго прыходу ня будуць заплочаны належныя грошы, дык будзе спынены водпуск вады і электрыкі“.

Бязумоўна, што Эльвод сваім новым загадам хацеў зьбіраньне грошай за электрычнасьць і ваду паставіць на належную вышыню і кіраваўся пэўнымі выгодамі абанентаў: прыдзе інкасатар—абанент заплаціць і справа скончана.

Але нельга забывацца, што большасьць абанентаў - гэта рабочыя і служачыя, якія атрымліваюць зарплату 1 і 15. Можа здарыцца, што ў момант прыходу інкасатара—грошай, хоць дробных, ня будзе ў абанента, значыцца зараз-жа будзе спынены водпуск вады і электрыкі—што зьяўляецца вельмі нявыгодным.

Але гэта яшчэ ня ўсё—галоўнае гэта тое, што да гэтага часу плата за электраэнэргію зьбіралася ў нашых працоўных касах ашчаднасьці (касы ашчаднасьці прымалі плату толькі ад укладчыкаў касы) і гэта дало шмат зьберажэньняў ад сотняў і тысяч абанентаў. Зараз-жа пры новым загадзе Эльводу, шмат хто з укладчыкаў аўтаматычна выйдзе за сваей касы ашчаднасьці і гэта будзе моцным ударам па нашай маладой ашчаднай справе. Ці-ж у нашу задачу ўваходзіць паслабленьне тэмпу разьвіцьця зьберажэньняў у нашых працоўных касах ашчаднасьці?

Ёсьць яшчэ адна падрабязнасьць, на якую трэба зьвярнуць увагу: Белкамунбанк плаціць кожнаму інкасатару 35 р. у месяц пэнсіі, дае ім спэцвопратку і 5 кап. з абанентнага аркуша.

Ці гэта „рацыяналізацыя“ апарату?

С. Зэвічык.

Своечасова падрыхтуемся да сяўбы азіміны.

ПЛЯЦ АЗІМІНЫ ГЭТАЙ ВОСЕНЬНЮ МЯРКУЕЦЦА ПАВЯЛІЧЫЦЬ НА 1,5 ПРОЦ.—СЁЛЕТА ПАВІННА ШЫРОКА РАЗГАРНУЦЦА АЧЫСТКА НАСЕНЬНЯ ЖЫТА І ПШАНІЦЫ.—РАНЬНЯЕ ВОРЫВА ПАПАРУ—ЛЕПШЫ СПОСАБ ПАДНЯЦЬЦЯ ЎРАДЖАЙНАСЬЦІ.

Да сяўбы азіміны ў гэтым годзе пачынаюць рыхтавацца спачатку лета. Водлуг меркаваньняў Нарказему, сёлета вызначана пашырыць пляц азіміны па БССР на 1,5 проц.: у старых калгасах—на 3,4 проц., у індывідуальных гаспадарках—на 1,04 проц., і г. д. Увогуле ўдзельная вага азімага пляну стабілізуецца, але гэта пашырэньне пойдзе за кошт паднясьця аблог і раскарчовак.

У надыходзячую пасяўную кампанію зварачваецца ўвага на пашырэньне палепшанага насеньня. Сялянства атрымае да 16.000 цэнтн. палепшанага, а калгасы 14.000 цэнтн. сартавога насеньня. Адначасна з гэтым пастаноўлена шырока разгарнуць працу па ачыстцы насеньня. Сёлета мяркуецца ачысьціць 50 проц. усяго насеньня азіміны, што прыблізна, складае 106.000 тон. Што-ж датычыцца пратручваньня пшаніцы-азімкі, дык мяркуецца правесьці гэта мерапрыёмства на ўсе 100 проц. Сёлета будзе значна больш завезена мінэральнага ўгнаеньня. Ёсьць меркаваньні, што ў параўнаньні з мінулым годам, азімая сяўба будзе ў 3 разы больш забясьпечана ўгнаеньнем. У першую чаргу атрымаюць угнаеньне кантрактуючыя жыта (30.000 гэкт.) і ільнаводныя раёны. Аграмаджаны сэктар будзе цалкам забясьпечаны мінэральным угнаеньнем. Апроч гэтага, сёлета будзе заваннавана да 25.000 гэкт. і затарфавана да 5000 гэкт. Частка торфу падрыхтавана яшчэ летась.

З іншых агрыкультурных мерапрыёмстваў па падвышэньню ўраджайнасьці мяркуецца ўвесьці да 400.000 гэкт. палепшаных папараў. Зараз-жа павінны быць ужыты захады да раньняга паднясьця папару, асабліва сялянскага.

Вялікая ўвага адводзіцца на пашырэньне радавога севу. Усяго намечана засеяць радавымі сеялкамі да 25.000 гэкт. (у савгасах і калгасах—12.000 гэкт.). Дзеля гэтай мэты будзе завезена да асеньняй сяўбы да 500 новых радавых сеялак.

Своечасова трэба падрыхтавацца зараз да лушчэньня ржышча. У савгасах вызначана правесьці лушчэньне на ўсе 100 проц., у калгасах на 50 проц.

Урэшце, трэба спыніцца на зяблівым ворыве (араць на зіму). У сялянскіх гаспадарках вызначана зяблівага ворыва-на 70 проц. (752.000 гэкт.), у савгасах і калгасах трэба ўзараць на зіму ўсё поле.

Асобнае месца ў азімай пасяўной кампаніі будзе займаць арганізацыя групавых садоў у пасёлках і калгасах. Сёлета мяркуецца засадзіць да 2450 гэкт. такіх садоў.

Зараз перад мясцовымі органамі стаіць задача выкананьня на ўсе 100 пр. гадавога пляну па арганізацыі калгасаў і розных відаў вытворчай кааперацыі. Ёсьць меркаваньні, што па арганізацыі калгасаў гадавы плян будзе выкананы з перавышэньнем на 10.000 гэкт.

Гадзіна на пасяджэньні РКК.

Страшэнная сьпякота. Сонца бяз літасьці паліць абветраныя твары рабочых. І сьцены корпусаў дыхаюць сьпякотай, і рассыпаны ў беспарадку жвір, здаецца, падагрэтым і рыштаваньні абліты сонцам.

Пад ценямі дрэў стаіць нешта, насьпех пабудаванае, падобнае да доміка. Правільней—пародыя на домік. Тут зьмяшчаецца кіраўніцтва пабудовай.

У пакойчыку, з адчыненымі вокнамі, адбываецца пасяджэньне рабоча-кантрольнай камісіі—РКК.

— Як-жа я пайду на работу, калі доктар прызнаў мяне хворым? На цяжкай рабоце я працаваць не магу.

— Так што-ж мы з табой будзем рабіць?

— Дайце лёгкую працу.

— А яна ёсьць у нас?

— Я ведаю, што няма.

— Ну, дык што рабіць?

— Звольніце мяне і дайце выхадную дапамогу.

РКК ня ведае, як вырашыць гэта пытаньне: звольніць і выдаць выхадную дапамогу нельга—малы час працаваў рабочы, звольніць яго з прычыны хваробы—няма такіх законаў; пакінуць на будаўніцтве „шалтай-балтай“—нікому няма выгады.

— Трэба рабіць мэдыцынскі агляд у часе прыёму новых партый рабочых,—кажа намесьнік прараба.

— Але гэта не вырашэньне справы,—даводзіць прадстаўнік рабкому.

„Канфлікт“ адкладваецца да чарговага пасяджэньня. Трэба даведацца канчаткова, як паступаць у даных выпадках, як выйсьці з такога заблытанага становішча.

Дзесятнік робіць умову з рабочымі на „зьдзельшчыну“, а адміністрацыя выдае зарплату падзённа; зрабілі няправільны вымер складзенай сьцяны; парушаецца калектыўная ўмова; просьба павялічыць расцэнкі; заява аб пераводзе ў вышэйшы разрад; грубыя адносіны ніжэйшага адміністрацыйнага пэрсаналу да рабочых—гэта ня зусім поўны пералік часткі пытаньняў, якія прыходзіцца разглядаць РКК.

Выклікаюць рабочага, які падае заяву, зачытваецца скарга, апытваюцца бакі. Калі што-небудзь буйнае—перадаюць у вышэйшыя органы. Ніхто ня пойдзе з РКК без адказу. Бываюць і неабгрунтаваныя, недарэчныя скаргі.

Прыходзіцца даводзіць рабочаму, што погляд яго памылковы, што сапраўднае становішча рэчаў іншае. Часта сустракаюцца выпадкі, што рабочы прызнае няправільнасьць сваіх думак, і выходзіць з насьпех пабудаванага доміку задаволены пастановай РКК, хоць і не ў яго карысьць!

— А мне авансу рублёў пяць,—гэта ня скарга ў РКК, а просьба работніцы да старшага прараба.

— РСІ забараніла выдачу ўсякіх авансаў.

— Мне рубель хоць бы, ня мае на капейкі.

Прараб маўчыць. Дастае „партманэт“, глядзіць у яго, знаходзіць рубель:—калі ласка, з уласных грошай, але РСІ забараніла выдачу авансаў.

Пастанова РСІ досыць радыкальная і неабходная ў дачыненьні да савецкіх служачых, а вось з рабочымі, асабліва з сэзоньнікамі, якія прыяжджаюць з вёскі бяз грошай, трэба перагледзець пытаньне: сыстэму дробных авансаў касаваць ня трэба.

Гудок абвясьціў аб сканчэньні работы. Рабочыя накіраваліся да сталоўкі. І РКК, акладваючы ў папку заявы, спыніла на гадзіну работу.

— Яшчэ хопіць да вечара—трэба сьпяшацца папалуднаваць.

З—ны.

ХРОНІКА.

Падрыхтоўка да новага прызыву.

Менскі акруговы вайсковы камісар тав. Місьнікаў у гутарцы з нашым супрацоўнікам зазначыў, што ня так даўно на сэкратарыяце акругкому партыі быў абгавораны даклад акрваенкамату аб падрыхтоўчай працы да надыходзячага прызыву.

Мясцовым партыйным і савецкім арганізацыям дадзены ўжо дырэктывы аб разгортваньні арганізацыйнай і агітацыйнай працы па растлумачэньні прызыўнікам і, наогул, насельніцтву задач, якія стаяць перад нашай Чырвонай арміяй.

Ужо апублікавана абвяшчэньне акрваенкамату аб тэрміне падачы заяў на атрыманьне ільгот па сямейным і маемасным становішчы і парадак прадастаўленьня льгот.

Для спрашчэньня парадку разгляду заяў аб льготах сёлета пры райвыканкомах утвораны камісіі, якія будуць вызначаць права на прадастаўленьне прызыўніку льготы. Канчатковую пастанову аб льготах будзе рабіць акруговая камісія.

У сярэдзіне ліпеня будуць абвешчаны сьпісы асоб, якім прадастаўлена льгота ці адмоўлена.

У часе падрыхтоўчай кампаніі па ўсіх сельсаветах акругі будуць праводзіцца канфэрэнцыі прызыўнікоў разам з мясцовым насельніцтвам.

Трэба зазначыць, што ў сёлетнюю прызыўную кампанію ставіцца задача—ні ў якім разе не дапусьціць у Чырвоную армію сацыяльна-чужы і небясьпечны элемэнт. Гэта праца цалкам ускладаецца на нашы нізавыя партыйныя і савецкія арганізацыі, якія пры правядзеньні падрыхтоўкі да прызыву павінны ўцягваць у яе шырокія масы батракоў, беднякоў і серадняцтва.

Асобы, якія па сваім сацыяльным складзе ня будуць дапушчаны ў Чырвоную армію, будуць залічацца ў тылавое апалчэньне, і яны будуць уносіць адпаведны падатак.

Як і летась, акруга будзе разьбіта на некалькі прызыўных вучасткаў.

Пры гэтых вучастках будуць абсталёваны чырвоныя куткі, забясьпечаныя адпаведнай літаратурай, плякатамі, лёзунгамі і г. д. Наогул, уся праца па культурным абслугоўваньні прызыўнікоў будзе праводзіцца праз гэтыя чырвоныя куткі.

Вынікі мопраўскага канцэрту.

Валавы збор з канцэрту, што наладжваў Менскі акруговы камітэт Мопру, дасягнуў 5175 руб.

За вылікам розных выдаткаў па аплаце артыстаў і арганізацыйных, чысты прыбытак ад вечару-канцэрту складае 2800 р.

Сацыялістычнае спаборніцтва паміж ВНУ.

ЦБ сэкцыі навуковых працаўнікоў абгаварвала магчымасьць правядзеньня сацыялістычнага спаборніцтва паміж ВНУ і навукова-дасьледчымі ўстановамі БССР.

У аснову гэтага спаборніцтва ЦБ раіць высунуць наступнае: пасьпяховасьць, ідэолёгічны вытрыманы зьмест навуковых і навучальных праграм, грамадзкая актыўнасьць студэнцтва і настаўніцтва, мэтадалёгічныя і навуковыя дасягненьні ВНУ і НДУ і ўвязка іх прац з сацыялістычным будаўніцтвам, беларусізацыя, падрыхтоўка новых кадраў і г. д.

Уся праца па спаборніцтву павінна пачацца нізавымі арганізацыямі, і павінна ахапіць як навуковых працаўнікоў, так і студэнцтва.

10.000 РУБ. У ФОНД ІМЯ ЛЕНІНА.

Паводле ранейшай пастановы Менскі акруговы фонд імя Леніна на барацьбу з дзіцячай бяспрытульнасьцю за 5 год павінен дасягнуць 50.000 руб. Палова фонду складаецца з мясцовага бюджэту, а рэшта з адлічэньняў па ўсіх мерапрыёмствах для адшуканьня сродкаў на барацьбу з дзіцячай бяспрытульнасьцю.

Летась з мясцовага бюджэту было адпушчана ў фонд імя Леніна 10.000 руб. Пазаўчора прэзыдыум Менскага акрвыканкому прапанаваў Акрфа перавесьці ў фонд яшчэ 10.000 руб. з бюджэту бягучага году. Побач з гэтым арганізавана акруговая камісія па распараджэньню гэтым фондам.

У Менскім Інстытуце Аховы Працы.

Інстытут Аховы Працы зараз займаецца вывучэньнем скуранай прамысловасьці. Апрача таго, пад кіраўніцтвам Інстытуту ў Аршанскай акрузе вывучаецца на фабрыцы „Дняпроўская Мануфактура“ стамляемасьць рабочых у сувязі з пераходам на 7 гадзінны рабочы дзень; у Віцебшчыне—праца сплаўшчыкаў лесу; у Бабруйшчыне на Мар'інскім масыве—умовы мэліарацыйных работ; у Гомельшчыне—будаўнічыя работы.

* *

Інстытут аховы працы ў бліжэйшыя дні арганізуе сталую кансультацыю для рабочых па пытаньнях аховы працы. Побач з гэтым Інстытут будзе праводзіць сыстэматычныя лекцыі па гэтых-жа пытаньнях на шэрагу прадпрыёмстваў Менску. Рыхтуюцца да друку папулярныя нарысы „Здароўе і праца“ на беларускай мове пад рэдакцыяй дырэктара ІАП д-ра Дзехцяра.

Беларускія курсы для настаўнікаў РСФСР.

У бліжэйшыя дні ў Менску адчыняюцца месячныя курсы для перападрыхтоўкі настаўнікаў беларускіх школ РСФСР. На курсы з розных куткоў РСФСР прыедзе звыш 30 настаўнікаў. Курсы будуць утрымоўвацца за сродкі Наркамасьветы РСФСР. У праграму курсаў уваходзяць пытаньні палітычныя, выхаваўчай працы школ, сельскай гаспадаркі і прадметы беларусазнаўства.

Да гастроляй дзяржаўнага цырку.

Учора на культнарадзе пры Культаддзеле ЦСПСБ прадстаўнік дзяржцырку зрабіў інфармацыю аб надыходзячых гастролях дзяржаўнага цырку. Гастролі працягнуцца $1^1/_2$ месяца.

Культнарада вырашыла скідку на білеты ў цырк для членаў прафсаюзаў даваць ня менш 30 проц. з кошту білета. Мяркуецца арганізоўваць масавыя паходы рабочых у цырк. Для папулярызацыі цырку, адміністрацыя апошняга будзе наладжваць выезд артыстаў цырку на прадпрыёмствы Менску.

Выданьне кніжак для скончыўшых лікпункты.

Цэнтральны Савет Таварыства „Прэч Няпісьменнасьць“ здаў у друк 2 кніжкі „Сталін аб Леніне“ і „Калгас „Бальшавік“. Рыхтуецца да друку яшчэ 5 папулярных кніжак. Кніжкі гэтыя вызначаны для чытаньня скончыўшым лікпункты. Яны будуць дармова дасланы ў хатычытальні, чырвоныя куткі і пачатковыя школы сацыяльнага выхаваньня.

Новы працкалектыў.

Нар. Кам. Працы БССР пастанавіў адчыніць новы працкалектыў па вырабу бляхавага і цынкавага начыньня ў г. Барысаве.

Гэты працкалектыў будзе адчынен у жніўні і дасьць работу 100 чалавекам беспрацоўных.

Апавяшчэньні.

З тае прычыны, што студэнты Беларускай Дзяржаўнай Акадэміі С.-Г. 4 курсу ўсіх сэкцый агранамічнага факультэту з 1-ІІІ па 1-VI г. г. былі мабілізаваны па падняцьці ўраджайнасьці па акругах БССР, урэшце чаго напалову з імі былі спынены вучэбныя заняткі.

Згодна пастановы праўленьня акадэміі з мэтай, каб даць магчымасьць мабілізаваным студэнтам закончыць курс у гэтым годзе—вызначан спэцыяльны летні трымэстр, заняткі на якім пачнуцца з 1 чэрвеня і будуць працягвацца да 1 жніўня г. г., а пагэтаму к пачатку заняткаў, г. значыць к 1-VI усе мабілізаваныя студэнты павінны прыбыць у акадэмію.

У чацьвер 30 мая г. г. роўна ў 7 гадзін ўвечары апошні сход сэкцыі антырэлігійнага выхаваньня.

ПАРАДАК ДНЮ:

1. Мэтодыка антырэлігійнай працы ў II-й групе (д. з Цэнтральнай дасьледчай школы).

2. Інфармацыя І і IV школ аб антырэлігійнай працы.

3. Падагульненьне працы сэкцыі за год. Яўка сяброў сэкцыі абавязкова. Запрашаецца настаўніцтва.

— 3 чэрвеня а 6-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні клюбу Гарсавету (Пляц Волі) адбудзецца шырокая нарада актыву ЦКК-РСІ з наступнай абвесткай дню:

1. Даклад Аб'яднанага Бюро Скаргаў НКРСІ (дакл. т. Лазоўскі).

2. Плян перавыбарнай кампаніі рабочых засядацеляў Аб'яднанага Бюро Скаргаў.

На нараду выклікаюцца: члены ЦКК і Мен. АКК, якія знаходзяцца ў Менску рабочыя засядацелі Аб'едн. Бюро Скаргаў добраахвотнікі, кіраўнікі груп „лёгкай кавалерыі“, дэлегаткі, вылучаныя для працы ў Бюро Скаргаў, сябры сэкцыі РСІ Менгарсавету, прадстаўнікі ад ячэйкі КП(б)Б, КСМ і фабзаўмясцкомаў.

— Групком № 7, саюзу Працасьветы паведамляе працаўнікоў усіх дашкольных устаноў гор. Менску, што ў пятніцу 31-га мая, а 7 гадз. увечары адбудзецца агульны сход дашкольнікаў у памяшканьні Дому Асьветы.

ПАВЕСТКА ДНЮ:

1) Даклад т. Ашэровай аб становішчы дашкольных устаноў гор. Менску і садаклад т. Жыўлюка.

Групком 7.

ПЭДГАБІНЭТ.

30-V а 7 г. увечары, у памяшканьні Пэдгабінэту назначаецца агульны сход сяброў пэдалёгічнай асацыяцыі пры М. К. Наркамасьветы, на які запрашаюцца ўсе настаўнікі школ.

Даклады:

1. „Характар. дзіцяч. калектыву і кантэнту з боку фічычнага разьвіцьця і разумовай здольнасьці“—д-р Эйнгорн і Пікулік.

2. „Характ. прафэс. інтарэсаў канчаючых сямігодкі“.

Загадчык Псыхатэхн. лабар. ГАЙВАРОЎСКІ.

— У суботу 1-га чэрвеня г. г. а 6 гадзіне ўвечары у памяшканьні Цэнтральнага Дому Селяніна склікаецца 1-я Менская Акруговая Канфэрэнцыя Саюзу Бязбожнік. Усім ячэйкам СБ г. Менску, якія яшчэ не абралі дэлегатаў, належыць у працягу гэтага часу абраць дэлегатаў на канфэрэнцыю.

Мандаты дэлегатам на канфэрэнцыю будуць выдавацца з чацьвярга 29 мая г. г. у памяшканьні Менакрсавету СБ.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

Катыроўка пазык на 30 мая 1929 г.

	Пакуп.	Праз
1-я 6 проц. залат. выйгр. пазыка	4.93,5	—
2-я 6 проц. залат. выйгр. пазыка	5.00	—
Бяспроц. залат. выйгр. пазыка 1926 г.	125.75	127.75
10 проц. дзярж. выйгр. пазыка 1927 г.	25.77	25.87
6 проц. дзярж. выйгрыш. пазыка індустр.	25.25	25.35
3-я сялянск. выйгр. пазыка 1927 г.	5.05	—
12 проц. дзярж. унутр. пазыка 1927 г.	105.96	—
2-я 6 проц. паз. проц. вып.	26.43	26.53
Пазыка Індустр. бяспр.	25.67	25.77
11 проц. унутр. паз. 28 г.	102.70	102.75
Дзярж. пазыка 29 г.	100.03	100.30

НОВЫЯ КНІГІ.

Паступілі ў рэдакцыю газэты „Савецкая Беларусь“ для рэцэнзіі наступныя кнігі выданьня Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

1. „Новае жыцьцё“ Бялевіч К., Капаевіч П., Сьцепановіч Ф. Чытанка для школ малапісьменных. Навукова-Мэтодолёгічным Камітэтам пры Наркамасьветы БССР. Дапушчана ў якасьці падручніка для школ малапісьменных і гурткоў па ліквідацыі малапісьменнасьці.

Стар. 284. цана 90 кап.

3. „Галоўныя вынікі работы раённых с.-г. дасьледчых Станцый БССР у галіне рольніцтва“ М. Савіцкі. Стар. 96, цана 40 кап.

4. „Ці можа перарадзіцца пшаніца ў жыта, жыта—ў мятліцу, авёс—у аўсюг“ Ю. Рэго. Стар. 21, цана 8 кап.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

Беларускае т-ва драматычных пісьменьнікаў і кампазытараў

ПАДЗЯЛЯЕ РАЗАМ З СВАІМ СЯБРАМ,

Флёрыянам Ждановічам

глыбокі сум з прычыны неспадзяванае сьмерці дачушкі яго

НУНЫ

ТЭАТР-КІНО

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.

Чацьвер, 30 мая

АДКРЫТЫ СПЕКТАКЛЬ **„І Н Г А“** ПРЭМ'ЕРА.

Сучасная п'еса ў 4 дзеях, 12 абразох.)—(Білеты ў касе тэатру.

Пачатак а 8 гадзіне ўвечары.

ЛЕТНІ ТЭАТР „ПРОФІНТЭРН“

Гастролі Маскоўскага Экспэрымэнтальнага балету.

Чацьвер, 30 мая.

АПОШНІ АДКРЫТЫ СПЭКТАКЛЬ **„ЛЕБЕДИНОЕ ОЗЕРО“.**

Пачатак а 9 гадз. увечары.

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА“ — З 28 мая. **„Памылкі генэрала Страхі“** І КІНО-ХРОНІКА САВКІНО № 15.

КІНО-САД «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» Савецкая № 71. — З АЎТОРКА, 28 МАЯ. З прычыны вялікага посьпеху 2-гі тыдзень **„Ч А Н Г“.** Пачатак 1 сэансу а 9 г. увечары.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». — МАСТАЦКІ ФІЛЬМ **„СЭРЦА І ДАЛЯРЫ“** у 8 частках. Пачатак 1-га сэансу а 7 з пал. гадз увечары.

КІНО ПРАЛЕТАРЫ — З 28 МАЯ. **„КАХАНЬНЕ Ў ПРЫРОДЗЕ“** Пачатак а 7 гадзіне.

УСТУПНЫ БАЛЯНС

Мсьціслаўскага раённага камбінату Аршанскае акругі на 1 кастрычніка 1928 года.

АКТЫЎ	Прыватная сума	Агульная сума	ПАСЫЎ	Прыватная сума	Агульная сума
1. Каса		833—83	1. Аснаўны статутны капітал		131384—41
2. Пай		208—72	2. Фонд павялічэньня статутнага капіталу		
3. Збожжа на складах		310—20	3. Зваротны капітал		6213—42
4. ДЭБІТОРЫ: а) розныя ўстановы і асобы	5069—39		4. Рэзэрвовы капітал		
б) ненадзейныя даўгі	1863—50	6932—39	5. Амартызацыйны капітал		
5. МАЕМАСЬЦЬ: будынкі	76682—50		6. Фонд пагашэньня ненадзейных даўгоў		1863—50
абсталяваньне	46890—23	123572—73	7. Крэдыторы		8863—08
6. Нясканчаныя пабудовы		43016—04	8. Доўгатэрміновыя пазыкі		26550 —
Балянс	—	174874—41	Балянс	—	174874—41

Заг. камбінату ЛІЎШЫЦ. Бухгальтар БЕЛЯНКА.

ЗГУБЛЕНЫ.

Чырвонаарм. кніжка пераменнага саставу нараджэння 1905 г., выд. 4-м Чырвоназн. палком; сяброўскі білет № 654, выд. саюзам чыгуначнікаў; камсамольскі білет № 372 на імя Вараноўіча В. М., кв. 242-п.

Чырвонаарм. кніжка пераменнага саставу Драгуна Р. К., выд. 4-м Чырвоназн. палком, кв. 242-п.

Асабова-вайсковая кніжка, выд. Барысаўскім ваенкаматам; сяброўскі білет саюзу дрэваапрацоўнікаў; паляўнічы білет, выд. Барысаўскім саюзам паляўнічых на імя Дашчынскага А. І., кв. 242-п.

Вучотна-конская кніжка Старажыцкага І. Н., выд. Барысаўскім уваенкаматам, кв. 242-п.

Сяброўскі білет Вербіцкага А. А., выд. саюз. працаўн. зямлі і лесу, кв. 242-п.

Чырвонаармейская кніжка Сінькевіча М. Д., выд. 4 Чырвоназн. палком, кв. 242-п.

Сяброўскі білет № 2014 Лелякіна І. Н., выд. саюзам савгандальслужачых, кв. 242-п.

Лекавая кніжка, выд. Барысаўскай страхкасай і сяброўская кніжка, выд. саюзам папернікаў на імя Моска А. Я., кв. 242-п.

Сяброўскі білет касы ўзаемадапамогі саюзу водн. транспарта на імя Лютарэвіча І. В., кв. 242п.

Сяброўскі білет Савельева І. І., выд. саюзам хімікаў, кв. 242-п.

Сяброўскі білет Рымша М. А., выд. саюзам хімікаў, кв. 242-п.

Сяброўскі білет Мацура І. І., выд. саюзам чыгуначнікаў, кв. 242-п.

Бальнічны лісток за № 5624595 Гурэвіча А. Б., выд. Барысаўскай страхкасай, кв. 242-п.

Гр-н Кірычэнка Ерамей Іосіфавіч, селянін, батрак, халасты, які паходзіць з Кіеўскай акругі, Пераяслаўскага раёну, с. Харкаўцы зьмяняе сваё імя Ерамей на імя Уладзімер, у сучасны момант гр. Кірычэнка Ерамей Іосіфавіч пражывае ў Полаччыне. Асоб, якія маюць перашкоды да зьмены імя памянёнага грамадзяніна, просьба паведаміць аб гэтым у Полацкі ЗАГС, паказаўшы сваё імя, па бацьку і прозьвішча.

Гр. Кавалёў Цімафей Пятровіч паходзіць з гр-н Маскоўскай губ., Клінскага павету, Вертлінскай вол., в. Шахматава, пражывае ў сучасны момант у г. Віцебску па Валадарскай вул. 40, зьменьвае прозьвішча „Кавалёў“ на „Багатыроў“. Да асоб, якія маюць што-небудзь супроць зьмены прозьвішча, просьба паведаміць Віцебскі Загс.

Чырвонаарм. кніжка пераменага саставу Францкевіча І. Д., выд. 4 Чырвоназнам. палком, кв. 242-п.

Чырвонаарм. кніжка пераменнага саставу Галуза П. Т., выд. 4 Чырвоназн. палком, кв. 242-п.

Мэтрычная выпіс Граковіча А. Н., выд. Астраш.-Гарадзецкім РВК, кв. 242-п.

Пасьведчаньне аб сканчэньні школы Смалявіцкага с.-с., Граковіча А. Н., кв. 242-п.

Кніжка № 632 Фанарэўскага І. Л. на кармленьне дзіцяці, выд. Барысаўскай страхкасай, кв. 242-п.

Чырвонаарм. кніжка Мароза І. Г. гр-на хут. Татарка, Брадоўскага сельсавету, кв. 246-п.

Залогавы квіт за № 171-271 Пекуроўскага І. Б., выд. 23-IV—29 г. Маз. аг-вам дзярж. банку аб залоге аблігац. 1 займу індустр. за № 027588 сер. 21 на 25 руб. кв. 247-п.

Сяброўскі білет Партнога С. Я., выд. Калінкавіцк. саюзам прац. зямлі і лесу.

Сяброўскі білет, выд. Калінк. Акр. Аддз. Сувязі, 2) кандыд. кніжка, выд. Акругкомам КПБ; 3) кніжка, выд. Калінкавіцк. с.-гасп. т-вам на імя Века І. А.

Паявая кніжка Глінера А. М., выд. Калінкавіцк. спаж. т-вам.

Пашпарт Казлоўскага І. В., выд. Калінкавіцк. РВК.

Квіт на 11 р. 09 к. Зарэнка . С., выд. Калінкавіцк. л-вам.

Паявая кніжка Севярына А. С., выд. Калінкавіцк. спаж. т-вам.

Паявая кніжка Карынеўца М. Г., выд. Калінкавіцк. спаж. т-вам.

Вучотная конская кніжка № 728 Отчыка М. Г., выд. Калінкав. РВК.

Вучотна-конская кніжка № 3923 Дулуба П. Т., выд. Калінкав. РВК.

Кніжка № 603 Камісарчыка А. Ф., выд. Калінкав. спаж. т-вам.

Кніжка № 1823 Малашчыка К. В., выд. Калінкав. с.-гасп. т-вам.

Кніжка Гольдштэйн Т. Я., выд. Калінкав. спаж. т-вам.

Вайсковая кніжка Злаціна Ш. Б. Я., выд. Мсьціслаўскім ВВК, кв 238-п.

Паявая кніжка № 4688 Дакуко М., выд. Барысаўскім ЦРК, кв 239-п.

Пэнсіён. кніжка № 333 Дарашковай А. А., выд. Барысаўск. страхкасай, кв. 240-п.

Пашпарт Іванцовай Е. А., выд. Барысаўскай міліц., кв. 241-п.

Асабовае пасьведчань. Грыгарчэнка К. А., выд. Смаленскай міліц., кв. 242-п.

Сяброўская кніжка № 13415 Паўлініна Т. К., выд. саюзам чыгуначн., кв. 242-п.

Галоўліт № 559.

Менск, дзяржаўная друкарня.